© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 94 (2454)
28 лістапада 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

УСЕСАЮЗНЫ КАЛГАСНЫ СХОД

Увага ўсіх савецкіх людзей, нашых сяброў за мяжой апошнія дні была прыкавана да Масквы, Крамлёўскага Палаца з'ездаў, дзе праходзіў III Усесаюзны з'езд калгаснікаў.

З вялікім энтузіязмам і ўдзячнасцю дэлегаты з'езда ўспрынялі прывітанне Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР, у якім даецца высокая ацэнка калгаснаму сялянству, яго гераічным справам.

На з'ездзе з вялікай яркай прамовай, якая была выслухана з неаслабнай увагай, выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў.

Даклад «Аб новым Прыкладным Статуце калгаса» зрабіў член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР Д. С. Палянскі.

Праект новага асноўнага закона калгаснага жыцця горача, зацікаўлена абмяркоўваўся з'ездам. У кожнай прамове, што гучала ў гэтыя дні ў Палацы з'ездаў, выказваліся думы і імкненні ўсіх працаўнікоў сацыялістычных палёў — дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, зрабіць нашу краіну яшчэ больш магутнай і багатай.

ТРЭЦЯМУ УСЕСАЮЗНАМУ З'ЕЗДУ КАЛГАСНІКАЎ

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР горача вітаюць дэлегатаў III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў і ў іх асобе ўсё калгаснае сялянства, шматмільённую армію працаўнікоў вёскі — актыўных будаўнікоў камунізма.

З'езд калгаснікаў—буйная падзея ў жыцці калгаснага сялянства, усяго савецкага народа. Ён праходзіць у дні падрыхтоўкі да знамянальнай даты—100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна — правадыра і настаўніка працоўных, заснавальніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Вялікі Ленін стаяў ля вытокаў сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі. Ленінскі кааператыўны план вызначыў генеральны курс, па якім Камуністычная партыя павяла сялянскія масы да новага жыцця. З перамогай калгаснага ладу ў нашай краіне ўпершыню ў гісторыі зацвердзіліся ў вёсцы новыя вытворчыя адносіны, склалася і ўзмацнела сацыялістычная сістэма сельскай гаспадаркі.

Калгасны лад вытрымаў праверку часам. У памяці народнай ніколі не згасне бяспрыкладны подзвіг мільёнаў калгаснікаў і калгасніц на ратным і працоўным фронце ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны. Разам з усім нашым народам яны адстаялі заваёвы сацыялізма, за кароткі тэрмін залячылі цяжкія раны, нанесеныя вайной, і намнога пераўзышлі даваенны ўзровень вытворчасці.

Сучасныя калгасы—гэта буйныя механізаваныя, эканамічна моцныя, высокатаварныя гаспадаркі. Калгасам належыць велізарная роля ў забеспячэнні насельніцтва харчаваннем і прамысловасці — сыравінай.

Поспехі калгаснага будаўніцтва сталі магчымы дзякуючы таму, што партыя заўсёды кіравалася запаветамі У. І. Леніна. На ўсіх этапах сацыялістычнага пераўтварэння грамадства партыя як зрэнку вока ахоўвала і мацавала саюз рабочых і сялян. Рабочы клас актыўна змагаўся за ўмацаванне сацыялізма ў вёсцы, аказваў і аказвае велізарную дапамогу развіццю і ўмацаванню калгаснага ладу. Стварэнне магутнай сацыялістычнай прамысловасці дало магчымасць умацаваць і карэнным чынам пераўтварыць матэрыяльна-тэхнічную базу сельскай гаспадаркі. Сёння на калгасных і саўгасных палях працуюць каля двух мільёнаў трактараў, сотні тысяч збожжакаборачных камбайнаў, грузавых аўтамабіляў і шмат іншых машын.

У калгасах выраслі кваліфікаваныя кадры спецыялістаў, механізатараў, майстроў земляробства і жывёлагадоўлі. Сярод іх дастойнае месца па праве займаюць жанчыны-калгасніцы. Партыя, увесь савецкі народ з глыбокай павагай адносяцца да сялянскай працы, высока ацэньваюць яе.

Рост прадукцыйных сіл вёскі, умацаванне эканомікі калгасаў забяспечылі ўздым матэрыяльнага дабрабыту, культуры і паляпшэнне быту калгаснага сялянства. Намнога ўзраслі рэальныя даходы калгаснікаў. Яны атрымліваюць цяпер гарантаваную аплату працы, забяспечваюцца пенсіямі і іншымі дапамогамі.

У вёсках разгарнулася шырокае жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва, завяршаецца электрыфікацыя і радыёфікацыя, хутка распаўсюджваецца тэлебачанне. Плённа працуе шматлікі атрад сельскай інтэлігенцыі. Усё больш сціраюцца істотныя адрозненні паміж горадам і вёскай.

Як і прадбачыў У. І. Ленін, праца ў калектыўнай гаспадарцы, заснаванай на дасягненнях навукі і тэхнікі, змяніла духоўнае аблічча сялянства. Для яго характэрны калектывізм, высокае пачуццё грамадскага абавязку, вернасць вялікім ленінскім ідэалам, высокая працоўная і палітычная актыўнасць. Калгас стаў сапраўднай школай камунізма для сялянства.

Трэці Усесаюзны з'езд калгаснікаў сабраўся, каб прыняць новы Прыкладны Статут калгаса. Прымаючы гэтага дакумента з'явіцца важным гістарычным актам, які знамянуе сабой новы этап у развіцці калгаснага ладу і калгаснай дэмакратыі. Новы Статут будзе садзейнічаць вырашэнню галоўнай задачы, пастаўленай перад працаўнікамі вёскі XXIII з'ездам партыі, — забяспечыць высокія ўстойлівыя тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі і дзякуючы гэтаму дабіцца далейшага ўздыму ўзроўню жыцця народа.

Для паспяховага вырашэння пастаўленай задачы партыя і ўрад распрацавалі і настойліва ажыццяўляюць цэлы рад важнейшых мер. На сакавіцкім [1965 г.] Пленуме ЦК КПСС выпрацавана і ажыццяўляецца прынцыпова новая сістэма планавання, эканамічнага стымулявання вытворчасці і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў з адначасовым расшырэннем гаспадарчай самастойнасці калгасаў і саўгасаў.

На сучасным этапе развіцця прадукцыйных сіл краіны ва ўвесь рост паўстала задача тэхнічнага пераўзбройвання сельскай гаспадаркі. Яна вырашаецца па ўсіх асноўных напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу ў сельскай гаспадарцы: па лініі комплекснай механізацыі і хімізацыі ўсіх галін калгаснай і саўгаснай вытворчасці, шырокай меліярацыі зямель.

Дзяржава ўсё больш і больш накіроўвае сельскай гаспадарцы трактараў, камбайнаў, аўтамабіляў, мінеральных угнаенняў, павялічвае капітальныя ўкладанні ў меліярацыйнае будаўніцтва. Пад сельскую гаспадарку падводзіцца магутная сучасная матэрыяльна-тэхнічная база.

Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР заклікаюць калгаснікаў, усіх працаўнікоў вёскі паўней, з найбольшай аддачай выкарыстоўваць новыя магчымасці і велізарныя рэзервы, якія тояцца ў нетрах калгаснай вытворчасці. Найпершы абавязак працаўнікоў вёскі — навесці найстражэйшы парадак у землекарыстанні, забяспечыць правільную эксплуатацыю тэхнікі, арашаемых і асушаных зямель, дабівацца больш эфектыўнага ўжывання мінеральных угнаенняў і хімічных сродкаў аховы раслін, настойліва змагацца за павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, а таксама выкананне і перавыкананне кожным калгасам планаў продажу дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі.

Важнейшай умовай паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу ў сельскай гаспадарцы з'яўляюцца высокая кваліфікацыя людзей, веданне імі дасягненняў навукі і тэхнікі, укараненне навуковай арганізацыі працы, свядомая дысцыпліна калгаснікаў, іх актыўная барацьба за эканомію і ашчаднасць, за зніжэнне сабекошту прадукцыі і павышэнне рэнтабельнасці ўсіх галін грамадскай гаспадаркі.

Дарогія таварышы! У гэтыя знамянальныя дні мільёны працаўнікоў вёскі, як і ўсе савецкія людзі, высока нясуць сцяг сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар ленінскага юбілею. Няма сумнення ў тым, што калгаснае сялянства дастойна сустрэне гэту гістарычную дату.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, Савет Міністраў СССР выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што работа Трэцяга Усесаюзнага з'езда калгаснікаў, прыняцце ім новага Прыкладнага Статута калгаса і іншых рашэнняў акажуць вялікі ўплыў на далейшае развіццё калгаснага ладу і ўсёй сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі.

Плённай работы вам, таварышы дэлегаты з'езда!

Няхай жыве слаўнае калгаснае сялянства — вялікая стваральная сіла ў барацьбе за пабудову камуністычнага грамадства ў нашай краіне!

Няхай жыве і мацнее саюз рабочага класа і сялянства — непахісная аснова савецкага ладу!

Па шляху, указаным Леніным, наперад да новых перамог камунізма!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС — ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА САЮЗА ССР — САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР

Масква, Крамлёўскі палац з'ездаў

Група дэлегатаў у перапынку паміж пасяджэннямі; злева направа — старшыня калгаса «Савецкая Беларусь» Брэсцкай вобласці У. Бядуля, старшыня калгаса «Пралетарская воля» Стаўрапольскага краю, Герой Сацыялістычнай Працы С. Луцэнка, брыгадзір калгаса імя Леніна Перадгорнага раёна Стаўрапольскага краю, Герой Сацыялістычнай Працы А. Чупрынін, старшыня калгаса «Шлях Ільіча» Карачаева-Чаркескай аўтаномнай вобласці, Герой Сацыялістычнай Працы А. Аргуноў. Фотахроніка ТАСС.

ПРАМОВА ГЕНЕРАЛЬНАГА САКРАТАРА ЦК КПСС ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА

НА ТРЭЦІМ УСЕСАЮЗНЫМ З'ЕЗДЗЕ КАЛГАСНІКАЎ 25 ЛІСТАПАДА 1969 ГОДА

ДАРАГІЯ таварышы!

Дазвольце мне сардэчна павіншаваць вас з адкрыццём Трэцяга Усесаюзнага з'езда калгаснікаў і пажадаць поспеху ў яго рабоце. З'езд калгаснага сялянства Савецкага Саюза — гэта буйная палітычная падзея ў жыцці нашай краіны, усяго савецкага народа; ён, несумненна, адыграе вялікую ролю ў далейшым развіцці калгаснага ладу, у паспяховым вырашэнні задач камуністычнага будаўніцтва.

Састаў дэлегатаў з'езда — гэта жывая гісторыя калектывізацыі, нараджэння і перамогі сацыялізма ў вёсцы.

Тут мы бачым ветэранаў калгаснага руху, тых, хто, не шкадуючы сіл, пераадольваючы велізарныя цяжкасці, узнімаў сялян на будаўніцтва новага жыцця. Іх мужнасць, іх вернасць ленінскім запаветам, пранесеную праз усе гады барацьбы і выпрабаванняў, высока цэняць партыя і савецкі народ.

У гэтай зале знаходзяцца і прадстаўнікі сярэдняга пакалення калгаснага сялянства. Разам з ветэранамі яны вынеслі на сваіх плячах увесь цяжар суровых гадоў Вялікай Айчыннай вайны і аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі.

Самыя сардэчныя словы мы звяртаем да жанчын-калгасніц, працоўны подзвіг якіх, асабліва ў гады вайны з фашызмам, з'явіўся велізарным укладам у нашу агульную перамогу над ворагам.

Сярод дэлегатаў з'езда знаходзяцца прадстаўнікі маладой гвардыі калгасная сялянства, з ёй мы звязваем будучыню нашай сацыялістычнай вёскі. Мы глыбока верым, што, працягваючы справу старэйшых пакаленняў і памнажаючы іх вопыт, калгасная моладзь здолее правільна прымяніць свае веды, свой творчы запал у вялікай справе будаўніцтва камунізма.

Састаў дэлегатаў з'езда адлюстроўвае адну з найвялікшых заваёў ленінскай партыі — брацкую і непарушную дружбу народаў нашай шматнацыянальнай краіны. Усе нацыянальнасці нашай Радзімы прадстаўлены на гэтым з'ездзе.

Мы сардэчна вітаем дарагіх гасцей, прадстаўнікоў працоўнага сялянства сацыялістычных дзяржаў і іншых краін свету — нашых братоў па класе і барацьбе.

III Усесаюзны з'езд калгаснікаў знаходзіцца ў цэнтры ўвагі савецкай і міжнароднай грамадскасці. Характэрна, што ў вялікай размове, якая разгарнулася вакол праекта Статута і іншых пытанняў жыцця калгасаў, прынялі ўдзел **усе савецкія людзі** — і калгаснікі, і рабочыя, інжынерна-тэхнічная інтэлігенцыя, вучоныя, дзеячы культуры.

Мы з задавальненнем адзначаем, што на сходах, абласных і краявых канферэнцыях і рэспубліканскіх з'ездах калгаснікі выказалі аднадушнае адабрэнне палітыцы партыі, выпрацаваній XXIII з'ездам і Пленумамі ЦК КПСС. У ёй яны бачаць галоўную ўмову ўздыму сельскай гаспадаркі краіны.

III Усесаюзны з'езд калгаснікаў сабраўся ў знамянальныя дні, калі ўся наша краіна і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуюцца да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра і настаўніка — Уладзіміра Ільіча Леніна.

Ніхто так глыбока не разумеў інтарэсы і спадзяванні працоўнага сялянства, як У. І. Ленін; ён бачыў у сялянстве надзейнага саюзніка рабочага класа ў барацьбе за звяржэнне капіталізму і пабудову сацыялізма.

Працоўнае сялянства Краіны Саветаў, адданае ленінскім ідэям, паказала ўсяму свету, што яно баявы, непахісны саюзнік рабочага класа. Плячо ў плячо з рабочымі савецкае сялянства пераўтварала краіну, умацоўвала, абараняла сацыялізм і цяпер будуе камуністычнае грамадства.

I.

Таварышы! Некалькі дзесяцігоддзяў аддзяляюць нас ад тых незабыўных гадоў, калі ў нашай краіне ўпершыню ў гісторыі чалавецтва мы пачалі ствараць новы, сацыялістычны лад у вёсцы. Але колькі б ні адшумела часоў і падзей, колькі б ні змянілася пакаленняў, ніколі не сатруцца ў памяці народаў справы актыўных барацьбітоў за перабудову вёскі — першых камунараў, сельскіх камуністаў, камсамольцаў, настаўнікаў, сельскораў і ізбачоў, рабочых-25-тысячнікаў, работнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў.

Гэта былі героі вялікай бітвы. Гэта быў, час вострай класавай барацьбы пралетарыяту горада і вёскі са шматлікімі ворагамі сацыялізма.

У працэсе калектывізацыі партыі давялося зламаць шалёнае супраціўленне кулацтва і іншых класавых ворагаў, весці ўпартую барацьбу супраць трацкістаў і правых апартуністаў.

Цяпер усё гэта належыць гісторыі, а справа сацыялізма пайшла далёка наперад. З намі мільёны людзей, якія будуюць сацыялізм на розных кантынентах свету. І мы ўдзячныя ім за падтрымку і дружбу, за ўвагу да нашай работы і нашага вопыту.

Мы аб гэтым гаворым ад чыстага сэрца, з усёй шчырасцю. Савецкія людзі за сваю сацыялістычную гісторыю па-сапраўднаму зведалі, што значыць адзінаборства з міжнародным капіталам, пазналі цану дружбы, пачуццё локця, з якімі самая цяжкая дарога здаецца больш лёгкай і прамой.

На ўсіх этапах барацьбы за сацыялістычнае пераўтварэнне вёскі Камуністычная партыя кіравалася ленінскім кааператыўным планам.

Наша партыя добра ўяўляла сабе цяжкасці на шляху калектывізацыі і перш за ўсё такія, як тэхніка-эканамічная адсталасць краіны і прыватнаўласніцкая псіхалогія селяніна. Яна ўлічвала таксама складанасць умоў, у якіх знаходзілася наша, тады адзіная ў свеце краіна дыктатуры пралетарыяту. Капіталістычнае акружэнне, пастаянная пагроза ваеннага нападу патрабавалі правядзення сацыялістычных пераўтварэнняў за як мага найкарацейшыя тэрміны.

Партыя выбрала шлях калектывізацыі не выпадкова, не наўздагад. Ён быў абгрунтаваны навукова, наспеў гістарычна. Яго нельга было ігнараваць або абысці стараной.

Гады калектывізацыі сталі для рабочых і сялян сапраўднай школай палітычнай загартоўкі і класавай мудрасці. Сялянства на практыцы пераканалася, што яно можа ажыццявіць сваю адвечную мару аб свабодным і шчаслівым жыцці толькі ў саюзе з рабочым класам, у цесным згуртаванні вакол ленінскай партыі.

У працэсе калгаснага будаўніцтва мы не пазбегнулі пэўных памылак. Але гэта былі памылкі пошуку, памылкі з-за адсутнасці вопыту. Партыя сама смела выяўляла памылкі, адкрыта гаварыла аб іх народу і выпраўляла іх. На жаль, яшчэ і па сённяшні дзень знаходзяцца аматары неправялічваць выдаткі ў вялікай рэвалюцыйнай справе.

У ацэнцы калгаснага ладу Камуністычная партыя і савецкі народ адзіныя. Калгасны лад — гэта наша вялікая гістарычная заваёва.

Выдатная роля ў перамозе калгаснага ладу належыць рабочаму класу. Ён даваў сялянству **трактары, камбайны,** аўтамабілі і іншую тэхніку, ён быў і актыўным барацьбітом за стварэнне і ўмацаванне калгасаў. Лепшыя яго прадстаўнікі, пасланыя партыяй у вёску, разам з сялянамі арганізоўвалі першыя калгасы. Многія з іх прысвяцілі сваё жыццё калгаснаму будаўніцтву.

Вялікі ўклад у сацыялістычнае пераўтварэнне вёскі ўнеслі рабочыя саўгасаў. Яны паказвалі прыклад вядзення буйной гаспадаркі. Сёння саўгасам належыць значная роля ў забеспячэнні краіны прадуктамі сельскай гаспадаркі.

Заслугоўвае ўсенароднай падзякі дзейнасць нашай савецкай інтэлігенцыі. Тысячы спецыялістаў — настаўнікі, урачы, аграномы, землеўпарадчыкі, механікі — пайшлі на работу ў вёску і актыўна змагаліся за ўсталяванне ў ёй сацыялістычных адносін.

Творчая інтэлігенцыя сваімі творамі дапамагала партыі і народу ў вялікай справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. Успомніце «Узнятую цаліну» Міхаіла Аляксандравіча Шолахава, «Брускі» Фёдара Іванавіча Панфёрава, «Разбег» Уладзіміра Пятровіча Стаўскага і многія іншыя творы.

Аб сацыялістычнай вёсцы і яе героях і ў апошнія гады напісана нямала добрых твораў. Мы спадзяёмся, што нашы літаратары, а таксама дзеячы мастацтваў створаць новыя яркія, маштабныя творы, якія глыбока раскрываюць працэсы, што адбываюцца ў сучаснай сацыялістычнай вёсцы.

Рэвалюцыйнае супрацоўніцтва рабочага класа, сялянства і савецкай інтэлігенцыі забяспечыла перамогу сацыялізма, карэннае пераўтварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі і ўсяго жыцця сялян.

Калгасны лад прынёс сялянству новае жыццё, свабоднае ад эксплуатацыі, галечы, пастаяннага страху за сябе, за сям'ю, за гаспадарку. Людзі старэйшага пакалення памятаюць, што ў мінулым селянін быў прыгнечаны, непісьменны, бяспраўны і безабаронны, заставаўся ў адзіноце перад стыхійнымі сіламі прыроды і ўсякімі нягодамі.

Калгас пазбавіў селяніна ад цяжкага мінулага, даў яму трывалае месца ў жыцці, зрабіў гаспадаром свайго лёсу. **А гэта, таварышы, вялікая справа!**

Суровым выпрабаваннем для маладога калгаснага ладу была Вялікая Айчынная вайна. Калгаснае сялянства даказала ў гады вайны найвялікшую адданасць Радзіме, калгаснаму ладу, а калгасы з'явіліся адной з магутных сіл савецкага грамадства.

Буржуазныя палітыкі і псеўдатэарэтыкі не перастаюць узводзіць паклёп на калгасны лад, усяляк выхваляючы прыватнае прадпрыемніцтва. Але як бы ні выдасканальваліся буржуазныя прапагандысты, ім не ўтаіць страшэннай эксплуатацыі, збяднення і разарэння мільёнаў сялянскіх і фермерскіх гаспадарак у краінах капіталу.

Пасляваеннае развіццё капіталістычнай сельскай гаспадаркі з усёй пераканаўчасцю пацвярджае словы вялікага Леніна аб тым, што «капіталізм павышае тэхніку земляробства і вядзе яго ўперад, але ён не можа рабіць гэтага інакш, як разараючы, прыніжаючы і душачы масу дробных вытворцаў». (Поўны збор твораў У. І. Леніна, т. 19, стар. 343).

Вось толькі некаторыя факты наконт гэтага. У ЗША, напрыклад, за апошнія 18 гадоў разарылася 2 мільёны 600 тысяч, або 46 працэнтаў усіх фермерскіх гаспадарак краіны. У ФРГ прыкладна за гэты ж час колькасць сялянскіх гаспадарак скарацілася амаль на 600 тысяч, або на 26 працэнтаў, у Італіі ў 1961 — 1967 гг. разаралася штогод у сярэднім 67 тысяч сялянскіх гаспадарак. Як правіла, фермеры, якія разарыліся, становяцца батракамі або папаўняюць армію беспрацоўных.

Ці не такога лёсу жадаюць нашаму сялянству буржуазныя прапагандысты? Для савецкага сялянства пытанне аб шляхах развіцця вёскі вырашана даўно, вырашана канчаткова і беспаваротна. Іншага шляху наша сялянства не шукае і ў ім не мае патрэбы.

Велізарную гістарычную ролю калгаснага ладу ў лёсе савецкага сялянства і ўсёй нашай краіны цяжка пераацаніць.

З пункту гледжання **палітычнага** калгасны лад умацаваў Савецкую дзяржаву і яе галоўную аснову — саюз рабочых і сялян, забяспечыў рэальныя ўмовы для ўдзелу сялян у кіраванні грамадскай вытворчасцю, у вырашэнні агульнадзяржаўных спраў.

З пункту гледжання **эканамічнага** калгасны лад паставіў на службу сацыялізму і камунізму выгоды буйной вытворчасці, даў магчымасць развіваць сельскую гаспадарку на сучаснай індустрыяльнай аснове.

З пункту гледжання **сацыяльнага** калгасны лад не толькі пазбавіў працоўнае сялянства ад эксплуатацыі і галечы, але і даў магчымасць устанавіць у вёсцы новую сістэму грамадскіх адносін, якія вядуць да поўнага пераадолення класавых адрозненняў у савецкім грамадстве.

Ідэі вялікага Леніна аб кааперацыі, палітыка партыі ў вырашэнні сялянскага пытання поўнасцю вытрымалі праверку часам. Вопыт СССР і іншых сацыялістычных краін з усёй відавочнасцю паказаў, што будаўніцтва сацыялізма ў вёсцы — гэта адзіны шлях для сялянства да шчасця, аснова дабрабыту ўсіх працоўных.

II.

Таварышы!

Мы звяртаемся сёння да гісторыі калгаснага будаўніцтва не толькі дзеля таго, каб аддаць належнае гераічнаму мінуламу. Аб ім карысна памяць і ў імя будучыні. Наш савецкі народ стварае матэрыяльна-тэхнічную базу камуністычнага грамадства.

У ажыццяўленні гэтай вялікай задачы велізарнае значэнне мае ўсебаковае развіццё сельскай гаспадаркі краіны.

Для паспяховага ўздыму сельскай гаспадаркі ў нас ёсць неабходныя аб'ектыўныя ўмовы — велізарныя зямельныя ўгоддзі, буйныя сацыялістычныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якімі з'яўляюцца калгасы і саўгасы, магутная прамысловасць, перадавая навука, кваліфікаваныя і загартаваныя ў справах кадры—і, нарэшце, гэта мільёны выдатных працаўнікоў вёскі.

Як вы ведаеце, XXIII з'езд КПСС, сакавіцкі, майскі і кастрычніцкі Пленумы ЦК вызначылі асноўныя напрамкі нашай палітыкі і канкрэтныя задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на сучасным этапе. Пры гэтым мы імкнёмся да таго, каб у палітыцы партыі правільна спалучаліся інтарэсы дзяржавы, усяго нашага грамадства з інтарэсамі калгасаў і калгаснікаў.

Якія галоўныя напрамкі гэтай палітыкі? Калі сказаць у самым сціслым выглядзе, то гэта перш за ўсё далейшае ўмацаванне і ўдасканальванне машынна-тэхнічнай базы, шырокая меліярацыя зямель і хімізацыя сельскай гаспадаркі. Важнай асаблівасцю гэтай палітыкі з'яўляецца новы парадак планавання нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў, эканамічнае стымуляванне сельскагаспадарчай вытворчасці.

Задача заключаецца ў тым, каб паслядоўна ажыццяўляць выпрацаваную партыяй праграму развіцця сельскай гаспадаркі. Аб выніках нашай работы мы павінны меркаваць па практычных справах. Мы абавязаны быць строгімі аб'ектыўнымі ў ацэнцы ўласнай дзейнасці, не захвальваць і не перавялічваць свае дасягненні, але разам з тым і не замоўчваць іх. А галоўнае — бачыць недахопы, не запускаць і своечасова ліквідоўваць іх, уносіць карэктывы ў нашы планы, у нашу работу. Жыццё не стаіць на месцы, яно пастаянна ставіць новыя пытанні.

Таварышы! Выконваючы рашэнні XXIII з'езда і Пленумаў ЦК КПСС, калгаснае сялянства, работнікі саўгасаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі, партыйныя, савецкія і земельныя органы прыклалі ў гэтыя гады нямала намаганняў, каб дабіцца росту сельскагаспадарчай вытворчасці. Трэба адзначыць, што ўсе саюзныя рэспублікі, вобласці і краі дасягнулі станоўчых вынікаў у развіцці земляробства і жывёлагадоўлі.

Дазвольце паведаміць вам, таварышы дэлегаты, некаторыя даныя аб ходзе выканання рашэнняў з'езда і Пленумаў ЦК па сельскай гаспадарцы.

Сярэднегадавы аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі за 1965 — 1968 гг. павялічыўся ў параўнанні з папярэднім чатырохгоддзем на 18 працэнтаў, вытворчасць збожжа — на 15 працэнтаў, мяса — на 20 працэнтаў, малака — на 24, бавоўны-сырцу — на 22, цукровых буракоў на 47, сланечніку — на 25 працэнтаў. Я назваў найбольш важную прадукцыю.

Уздым сельскай гаспадаркі ў немалой ступені абумоўлен ростам прадукцыйнасці працы. Павялічыліся таксама дзяржаўныя закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Тэмпы росту вытворчасці і нарыхтовак у гэтыя гады былі вышэй за папярэднія гады.

Усё гэта дало магчымасць павысіць узровень спажывання насельніцтвам прадуктаў харчавання. У прыватнасці, спажыванне мяса на душу насельніцтва ў 1969 г. у параўнанні з 1964 г. павялічыцца на 8 кілаграмаў, малака — на 50 кілаграмаў, яек — на 36 штук.

Як вы ведаеце, гэты год для сельскай гаспадаркі быў цяжкім і складаным. Многія раёны краіны падвергнуліся мацнейшым ударам стыхійных сіл прыроды. Аднак і ў гэтым годзе вытворчасць і нарыхтоўкі асноўных сельскагаспадарчых прадуктаў будуць прыкладна на ўзроўні сярэднегадавых аб'ёмаў апошніх чатырох гадоў.

Значна павялічыліся капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку, хоць па шэрагу акалічнасцей зроблена ў гэтых адносінах не ўсё, што намі намячалася. За 1965—1968 гады капітальныя ўкладанні дзяржавы і калгасаў былі на 19 мільярдаў рублёў больш чым у папярэднім чатырохгоддзі.

Сур'ёзныя змены адбыліся за апошнія гады ў калгаснай эканоміцы, у жыцці калгаснікаў. Сёння калгасы — гэта буйныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якія аснашчаны сучаснай тэхнікай і маюць кваліфікаваныя кадры. Цяпер у сярэднім на калгас прыпадае больш 50 трактараў, дзесяткі грузавых аўтамабіляў, камбайнаў, электраматораў і шмат іншай тэхнікі. У 1935 г., калі праходзіў II Усесаюзны з'езд калгаснікаў, кошт асноўных фондаў калгасаў вызначаўся прыкладна ў 5 мільярдаў рублёў, а ў мінулым годзе ён перавысіў ужо сорак мільярдаў рублёў (у супастаўных цэнах), гэта значыць вырас у 8 разоў.

Устанаўленне цвёрдых планаў і эканамічна больш абгрунтаваных закупачных цэн на калгасную прадукцыю стала магутным стымулам развіцця вытворчасці і ўмацавання калгасаў. За апошнія гады даходы калгасаў і аплата працы калгаснікаў павялічыліся ў паўтара раза. Вёска стала больш актыўна добраўпарадкоўваща. За мінулыя чатыры гады толькі выдаткі калгасаў на гэтыя мэты амаль падвоіліся.

Разам з узрывам эканомікі і паляпшэннем сацыяльных умоў расце культура ў вёсцы. Савецкі селянін — гэта адукаваны чалавек. Больш як адна трэць калгаснікаў мае вышэйшую і сярэднюю адукацыю. Гэта, таварышы, найвялікшая перамога. Мне прыемна паведаміць вам, што, паводле даных рэгістрацыі, амаль палавіна дэлегатаў з'езда калгаснікаў таксама з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Многія калгаснікі, працуючы на палях і фермах, адначасова вучацца ў вышэйшых навучальных установах, тэхніхумах і сярэдніх школах. Працаўнікі вёскі выпісваюць цяпер больш 100 мільёнаў газет і часопісаў. Гэта таксама буйная перамога.

Шырокае ўкараненне навукі і тэхнікі ў сельскагаспадарчую вытворчасць мяняе характар працы калгаснікаў, стварае магчымасці для іх прафесіянальнага росту. Цяпер у калгасах налічваецца больш 2 мільёнаў механізатараў, каля 330 тысяч спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.

Механізатары, работнікі жывёлагадоўчых ферм і іншыя калгаснікі—гэта, як правіла, людзі, якія добра ведаюць сваю справу, далучаюцца да тэхнікі і навукі, разам са спецыялістамі ўсталёўваюць у вёсцы сучасную вытворчую культуру.

Такім чынам, і ў савецкай вёсцы цяпер створаны неабходныя матэрыяльна-тэхнічныя і сацыяльна-эканамічныя перадумовы для далейшага ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці і больш хуткага задавальнення патрэбнасцей народа.

Але вы, таварышы, разумееце, што такія буйныя праблемы, як комплексная механізацыя, хімізацыя, шырокая меліярацыя і іншыя, не могуць быць выраша-ны за 3—4 гады. На гэта спатрэбіцца і час і пэўныя матэрыяльныя рэсурсы, падрыхтоўка неабходнай вытворчай базы і кваліфікаваных кадраў.

III.

Таварышы!

За апошнія гады, як я ўжо гаварыў, мы павялічылі ўкладанні ў сельскую гаспадарку з тым, каб яшчэ больш умацаваць яе эканамічную аснову і паскорыць тэмпы развіцця. Партыя і ўрад і надалей будуць цвёрда праводзіць лінію на ўсямернае забеспячэнне калгасаў і саўгасаў сельскагаспадарчай тэхнікай, мінеральнымі ўгнаеннямі, транспартнымі сродкамі павялічваць укладанні на меліярацыю зямель, стымуляваць вытворчасць і нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

У бліжэйшы час, напрыклад, пачнецца будаўніцтва новага буйнога завода па вытворчасці грузавых аўтамабіляў, шэрагу прадпрыемстваў сельскагаспадарчага машынабудавання. Прамысловасць пераходзіць на выпуск больш прадукцыйных трактараў і камбайнаў, павялічваецца вытворчасць трактарных і аўтамабільных прычэпаў.

У сувязі з неабходнасцю значнага расшырэння вытворчасці тэхнікі для меліярацыі і аснашчэння жывёлагадоўчых ферм нам трэба спецыялізаваць шэраг прадпрыемстваў на выпуску гэтай тэхнікі і сканцэнтраваць кіраўніцтва імі.

Усямернае развіццё сельскай гаспадаркі, умацаванне яе матэрыяльна-тэхнічнай базы складзе адзін з галоўных напрамкаў новага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі краіны, які распрацоўваецца цяпер.

Цяпер, як ніколі, неабходны дакладнасць, зладжанасць у рабоце ўсіх звенняў вытворчасці і кіравання сельскай гаспадаркі, штодаённая барацьба за павышэнне прадукцыйнасці працы і зніжэнне сабекошту прадукцыі, арганізаванасць, дысцыпліна і высокая маральная адказнасць усіх работнікаў за даручаную справу.

Патрэбны канкрэтныя справы па выкананні планаў у кожнай рэспубліцы, краі і вобласці, у кожным калгасе і саўгасе, ва ўсіх цэнтральных органах і міністэрствах. Гэта—адна з важнейшых умоў далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ВОПЫТ ЛЕПШЫХ— УСІМ!

НАТАТКІ З РЭСПУБЛІКАНСКАГА СЕМІНАРА КУЛЬТАСВЕТРАБОТНІКАЎ

—У НАШЫМ калгасе «Уперад» сем паляводчых брыгад. А наш сельскі клуб мясцовыя жартаўнікі ахрысцілі восьмай брыгадай. І нас не крыўдзіць такі жарт, мы ганарымся гэтай назвай, і стараемся рабіць як мага больш, каб памагчы роднаму калгасу,—так пачала сваё выступленне загадчыца Дзераўнянскага сельскага клуба Слонімскага раёна Марыя Барысевіч.—Клуб не толькі выхоўвае і весяліць. На маю думку, клуб—гэта свайго роду сельскагаспадарчая акадэмія.

Уважліва слухала зала. Гаварыла Марыя цікава, усхвалявана. Яшчэ па дарозе ў Баранавічы Марыя ўспамінала, чым яна можа падзяліцца са сваімі калегамі, якім вопытам. Успомніла вечар, прысвечаны механізатарам. Народу набілася ў залу багата. Трактарысты, камбайнеры — іх больш паўсотні ў калгасе — адчувалі сябе імяніннікамі. Лепшым працаўнікам уручалі падарункі. Па іх заяўках самадзейныя артысты выконвалі песні. А некаторым, асабліва тым, хто любіць зазірнуць у шклянку, давялося і пачырванець: сатырычныя сцэнкі і частушкі «працэрлі» іх з пясочкам... Былі і яшчэ вечары, прысвечаныя жывёлаводам, паляводам. Падводзілі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, ушаноўвалі перадавых людзей, а перадавікі шчодра дзяліліся сваім вопытам.

Аб усім гэтым расказала Марыя ўдзельнікам семінара. І хоць на такіх занятках ці форумах не прыняты апладысменты, але, калі Марыя скончыла, у зале пачуліся дружныя воплескі. Так высока ацанілі дзейнасць Дзераўнянскага клуба бывалыя культасветработнікі — на семінар з'ехаліся дырэктары раённых дамоў культуры, загадчыкі клубаў выдатнай работы, важакі сельскай камсамоліі Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей. Праходзіў семінар пад дэвізам: «Ленінскаму юбілею — дастойную сустрэчу».

Слухаў я выступленні ўдзельнікаў семінара і міжволі ўспамінаў, як гадоў дзесяць назад працаваў загадчыкам сельскага клуба ў глыбіннай вёсцы Гаўрыленка на Магілёўшчыне. Прыехаў я туды з дыпломам культсветвучылішча і з цвёрдым намерам узняць культуру вёскі на недасягальную вышыню. У халодным памяшканні пры цьмяным святле лямпы пад акампанемент хрыпатага, нібы з прастуды, гармоніка праводзілі мы рэпетыцыі. Цёпла было толькі ў час канцэртаў, калі збіраліся людзі з усіх навакольных сёл...

Як непазнавальна змяніліся нашы клубы за апошні час! У вёсках выраслі новыя белакаменныя будынкі— сапраўдныя палацы культуры, па вечарах іх залівае электрасвятло. Ёсць у клубах цяпер баяны і нават цэлыя аркестры. Змяніўся, паглыбіўся змест работы культасветустаноў. Час нарадзіў новыя формы і метады культурна-масавай і выхаваўчай работы.

Пра гэта ішла гаворка ў змястоўным дакладзе, з якім выступіла начальнік упраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР Ж. Сінельнікава, пра гэта гаварылі дырэктар Рэспубліканскага Дома народнай творчасці Г. Талчынская, дырэктар Рэспубліканскага навукова-метадычнага кабінета культасветработы Л. Мыслівец, усе выступаючыя.

У Крывіцкім сельскім Доме культуры Мядзельскага раёна кожны жыхар гарадскога пасёлка знаходзіць сабе занятак па душы. Тут сталі традыцыйнымі тэматычныя вечары і канферэнцыі чытачоў аб сучасным герої ў літаратуры, працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці — у іх займаецца больш двухсот чалавек.

Ахвотна ідуць у свой клуб жыхары вёскі Вярэйкі, што ў Ваўкавыскім раёне. Тут можна паглядзець фільм аб сваім саўгасе, светагукавую газету, навучыцца фатаграфаваць, шыць і вышываць і г. д. Дырэктар клуба Барыс Пятровіч Сарокін — вопытны культасветработнік, заўзяты прыхільнік тэхнічных сродкаў. Ён паказаў удзельнікам семінара, што можна зрабіць з дапамогай звычайных эпідыяскопаў і фільмаскопаў, якія ў многіх клубах пыляцца без патрэбы.

Добра, што на семінар запрасілі камсамольскіх работнікаў. Каму як не моладзі быць гаспадаром клубаў. Цесная сувязь камсамола з культасветработнікамі прыносіць выдатны плён. Там, дзе такі кантакт устаноўлены, віруе культурнае жыццё, клубы робяцца цэнтрамі выхаваўчай работы, любімымі месцамі адпачынку сельскіх жыхароў.

Тры дні працягваўся семінар. Праграма яго была вельмі насычанай. Выступіла каля трыццаці чалавек. Акрамя таго, удзельнікі семінара пабывалі ў калгасе «Перамога» Баранавіцкага раёна, сустрэліся з яго старшынёй, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР А. Мацкоўскім. У клубе калгаса адбыўся цікавы тэматычны вечар «Ідэі Леніна жывуць і перамагаюць». Аб ім варта расказаць больш падрабязна.

На ўзгорку, у старым парку, размясціўся прыгожы белакаменны будынак. Гэта — клуб. Гасцей, удзельнікаў семінара, з хваляваннем сустрэлі піянеры мясцовай школы, і кожнаму прыкалолі чырвоны бант. Гучыць урачыстая музыка. Старшыня сельгасарцелі А. Мацкоўскі ў суправаджэнні лепшых працаўнікоў сяла ўнёс сцяг калгаса, «Дарагі Ільіч, дакладваем...» І старшыня, і брыгадзіры расказалі, якіх вынікаў дасягнула сёлета арцель.

Чуйная, напружаная цішыня ўсталёўваецца ў зале. З рэпрадуктара даносіцца голас правадыра: «Што такое Савецкая ўлада?..» Потым стары бальшавік, член партыі з 1920 года Дзмітрый Анісавіч Жукавец расказвае аб сваіх сустрэчах з Леніным. Гасне святло. На экране — хаты-развалюхі, у якіх жылі раней мясцовыя жыхары. А вось і сучасныя белакаменныя дамы калгаснікаў, добраўпарадкаваныя кватэры, не горшыя за гарадскія. Потым гучалі вясёлыя песні аб шчасці жыць і працаваць на нашай зямлі.

Спадабаўся гасцям канцэрт Баранавіцкага ансамбля танца «Юрачка». Вельмі прыемнае ўражанне пакінула выступленне агітбрыгады Берастовіцкага раённага Дома культуры.

Нельга не адзначыць вялікую работу, якую правялі арганізатары семінара. Добра, што з'ехаліся энтузіясты культуры, камсамольскія важакі, каб падвесці вынікі, падзяліцца думкамі аб тым, як рыхтуюцца асяродкі культуры да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, аб тым, што новага і цікавага з'явілася ў іх за час пераклічкі сельскіх клубаў. Але падобны форум культасветработнікаў праводзіцца ўпершыню, і, вядома, не ўсё было гладка. Мне захацелася даведацца, што думаюць аб семінары яго ўдзельнікі. Вось што давялося пачуць.

Жанна КАПТУР, загадчыца Крупскага сельскага клуба Крупскага раёна:

— Хацела і я выступіць, ды бачу, што і так многа доўгіх прамоў-справаздач. А методыкі ў іх — малавата. Называюць тэматычныя вечары. А як іх праводзілі, з якімі цяжкасцямі сутыкаліся? Пра гэта — ні слова. Шкада. Мы таксама праводзім вечары на падобныя тэмы. А ці лепшыя нашы, ці горшыя — меркаваць цяжка. Я працую сем гадоў, пасля заканчэння Магілёўскага культсветвучылішча. Добра ведаю, як складана ўсё на самай справе, як нялёгка даюцца гэтыя вечары і канцэрты...

Тэрэза КУМОК, метадыст Берастовіцкага раённага Дома культуры:

— Бачыла я тут метадыста-масавіка Рэспубліканскага Дома народнай творчасці Васіля Астапука. Чакала, што і яму дадуць слова. Мы ж маглі ў час перапынку развучыць цікавую гульню, новы танец, правесці віктарыну. Але ён так і не паказаў сваё майстэрства...

Міхась СУДНІК, дырэктар Маладзечанскага раённага Дома культуры:

— Мне спадабаўся тэматычны вечар у калгасе «Перамога». Пастрабуем і мы правесці нешта падобнае, возьмем за аснову іх сцэнарый. З цікавасцю слухаў я выступленне калегі — дырэктара Шчучынскага раённага Дома культуры Краўцова. Ён сказаў, што ў іх працуе школа перадавога вопыту для маладых культасветработнікаў. А як працуе, што яна сабой уяўляе — пра гэта ні слова. Думаў я пагутарыць з ім у перапынку, але не знайшоў. Прыйдзецца пісаць яму ліст. Увогуле ж такія сустрэчы-семінары — вельмі карысныя...

Праз некалькі дзён у Віцебску адбудзецца семінар культасветработнікаў і важакоў сельскай камсамоліі Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Думаецца, што арганізатарам гэтага семінара варта ўлічыць прапановы і заўвагі ўдзельнікаў Баранавіцкага. Каб семінар стаў сапраўднай школай перадавога вопыту, а дасягненні лепшых энтузіястаў культуры сталі здабыткам усіх.

Л. ЛЯВОНАЎ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ПРАМОВА ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ва ўсёй нашай рабоце па развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці мы павінны памятаць аб штогадовым прыросце насельніцтва краіны і аб усё ўзрастаючых патрэбнасцях нашага народа. Я не гавару ўжо аб неабходнасці мець дзяржаўныя рэзервы. Без іх мы не можам жыць. Гэта таксама ўваходзіць у нашы народнагаспадарчыя разлікі.

Вельмі многае ў развіцці прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі залежыць, вядома, ад вас, таварышы, — ад калгаснікаў, калгаснага актыву, спецыялістаў, кіраўнікоў калгасаў, усіх работнікаў сельскай гаспадаркі.

З вялікага кола пытанняў у галіне сельскай гаспадаркі мне хочацца асабліва звярнуць вашу ўвагу на тыя з іх, якія адносяцца да ліку галоўных у справе ўздыму гэтай важнай галіны.

Перш за ўсё пытанне аб **зямлі,** аб яе эфектыўным выкарыстанні і павышэнні ўрадлівасці. Вам, працаўнікам палёў, асабліва зразумелая значнасць **зямлі** ў жыцці чалавека. Зямля — гэта крыніца нашай сілы і нашага багацця.

Калгасы валодаюць велізарнымі масівамі ворнай зямлі, лугоў, пашы і лясоў. Зямля знаходзіцца ў вашых руках, таварышы, і ўсё калгаснае сялянства абавязана ўсяляк даражыць ёю, павышаць урадлівасць кожнага гектара. У аднолькавай ступені гэта адносіцца і да работнікаў саўгасаў, у распараджэнні якіх знаходзяцца таксама мільёны гектараў зямлі.

На неабходнасць усенароднай барацьбы за павышэнне культуры земляробства, арганізацыі сістэматычнай работы па ахове глебы ад эрозіі і дасягненне на гэтай аснове высокіх і ўстойлівых ураджаяў не раз указвалася ў партыйных і ўрадавых дакументах, а таксама ў Законе аб зямлі, прынятым Вярхоўным Саветам СССР.

Сёння даводзіцца яшчэ раз напамінаць аб гэтым таму, што ахова зямлі, павышэнне яе ўрадлівасці — абавязковая ўмова далейшага прагрэсу ў сельскай гаспадарцы. Гэта буйнейшая дзяржаўная праблема.

Калгасы і саўгасы абавязаны штодзённа працаваць над паляпшэннем зямлі, інакш яна будзе даваць менш прадукцыі, горш карміць нас.

Усе мы ганарымся тым, што прасторы нашай Радзімы неабсяжныя. Але з гэтага некаторыя людзі робяць памылковы вывад, лічачы, што зямельныя рэсурсы ў нас бязмежныя. Гэта далёка не так. Цяпер у краіне на душу насельніцтва прыпадае 0,94 гектара ворнай зямлі. У сувязі з ростам насельніцтва і расшырэннем будаўніцтва плошча ворнай зямлі ў разліку на аднаго чалавека штогод змяншаецца.

Нам трэба вельмі клапатліва адносіцца да зямлі, строга і ашчадна падыходзіць да адводу зямель пад будаўніцтва прадпрыемстваў, без чаго мы, натуральна, не абыдземся. Разам з тым трэба клапаціцца аб тым, каб не змяншаліся, а пастаянна павялічваліся плошчы прадукцыйных угоддзяў.

Ахова глебы — гэта справа ўсяго нашага грамадства. Любое псаванне зямлі трэба разглядаць як антыграмадскі ўчынак. Хто робіць замах на зямлю, нядбайна адносіцца да яе, не павышае яе ўрадлівасці, той падрывае зыходную матэрыяльную аснову дабрабыту народа.

Таварышы! Наша партыя, як вы ведаеце, выпрацавала праграму шырокай меліярацыі зямель і хімізацыі сельскай гаспадаркі. Гэта надзейны, правільны шлях павышэння прадукцыйнасці земляробства.

Пастаўкі мінеральных угнаенняў калгасам і саўгасам за чатыры гады пяцігодкі павялічыліся на 12,7 мільёна тон. У будучым годзе прырост паставак мінеральных угнаенняў зноў дасягне вялікіх аб'ёмаў — больш як восем мільёнаў тон. У меліярацыю за апошнія тры гады ўкладзена дзяржавай і калгасамі больш як 8 мільярдаў рублёў. Праведзены вялікія работы па арашэнні і асушэнні значных плошчаў. Ствараецца буйная вытворчая база для водагаспадарчага будаўніцтва.

Як вы ведаеце, мы шырока разгарнулі будаўніцтва такіх буйных водагаспадарчых будоўляў, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне, як Кахоўская, Краснадарская, Каршынская, Вялікі Стаўрапольскі канал і шэраг іншых.

Нядаўна Палітбюро разглядала пытанні арашэння зямель у Паволжы. У гэтым буйнейшым раёне таварнай вытворчасці збожжа часта здараюцца вельмі жорсткія засухі. У такія гады калгасы і саўгасы нясуць вялікія страты. У сваю чаргу дзяржава не толькі недаатрымлівае значную колькасць прадукцыі, але і вымушана выдзяляць гаспадаркам гэтых раёнаў насенне, фураж, прадукты харчавання, аказваць фінансавую дапамогу.

Каб пакончыць з гэтым шматвекавым бедствам, ёсць толькі адзін шлях — **арасіць гэтыя землі.** ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі рашэнне, якое кладзе пачатак вялікім работам па арашэнні Паволжа.

Як мы ўжо не раз адзначалі, вялікія перспектывы павелічэння вытворчасці прадуктаў сельскай гаспадаркі на аснове меліярацыі зямель маюць раёны нечарназёмнай паласы.

Мы і ў далейшым будзем узмацняць увагу да пытання меліярацыі і хімізацыі сельскай гаспадаркі, строга выконваць прынятую намі праграму.

Таварышы! Хоць гэта і не новая пастаноўка пытання, але даводзіцца паўтарыць, што асновай сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўляецца збожжавая гаспадарка. Яе стан, аб'ёмы вытворчасці збожжа ў рашаючай ступені ўплываюць на ўсе іншыя галіны і асабліва на такую важную галіну, як жывёлагадоўля.

Мы і надалей павінны трымаць вытворчасць збожжа ў цэнтры нашай увагі, рабіць усё неабходнае, каб з году ў год павышаць урадлівасць палёў і павялічваць валавыя зборы і закупкі збожжа.

Вялікія задачы стаяць перад намі ў развіцці жывёлагадоўлі. З гэтай галіной цесна звязана работа харчовай, лёгкай прамысловасці, а галоўнае — задавальненне штодзённых патрэбнасцей працоўных.

За апошнія гады ў галіне жывёлагадоўлі адбыліся станоўчыя зрухі, аб чым я ўжо гаварыў. У вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі мы не стаялі на месцы. Аднак гэта галіна пакуль яшчэ не поўнасцю задавальняе патрэбнасці насельніцтва, а яны з павышэннем матэрыяльнага дабрабыту народа будуць расці і далей. У той жа час у развіцці жывёлагадоўлі ёсць нямала нявырашаных пытанняў: нізкі ўзровень механізацыі ферм, недастаткова развіта прамысловасць па выпуску машын і абсталявання для жывёлагадоўлі, няма належнай увагі да ўмацавання кармавой базы ў многіх гаспадарках. Усё гэта нам трэба ўлічваць і прымаць неабходныя меры.

Цэнтральны Камітэт партыі лічыць, што не ўсе калгасы і саўгасы выкарыстоўваюць наяўныя магчымасці для павелічэння вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі, павышэння іх якасці і зніжэння сабекошту. Гэты недахоп трэба выправіць.

Хацелася б, у прыватнасці, звярнуць увагу на некаторыя пытанні нашай работы ў галіне жывёлагадоўлі.

Да гэтага часу многія гаспадаркі здаюць жывёлу на мясакамбінаты вельмі нізкай вагі і ўкормленасці. Самы просты разлік нашых спецыялістаў паказвае, што калі давесці здатачную вагу буйной рагатай жывёлы ў сярэднім па краіне да 350—400 кілаграмаў, то пры цяперашнім пагалоўі жывёлы мы можам павялічыць нарыхтоўкі мяса ў краіне прыкладна на два мільёны тон. Перадавыя гаспадаркі ўжо цяпер здаюць жывёлу нават больш высокай вагі.

Усе вы разумееце, што для павышэння прадукцыйнасці жывёлы неабходна перш за ўсё значна палепшыць работу па вытворчасці кармоў.

У выніку ажыццяўлення мер, прынятых сакавіцкім Пленумам ЦК, калгасы і саўгасы атрымалі магчымасць павялічыць выдаткаванне збожжа на фуражныя мэты ўжо на 35 працэнтаў. Гэта адыграла вялікую ролю ў росце прадукцыйнасці жывёлы і птушкі.

Але, таварышы, на тым жа сакавіцкім пленуме звярталася ўвага і на павелічэнне вытворчасці грубых і сакавітых кармоў. Аднак сур'ёзнага зруху ў гэтых адносінах не адбылося. Нарыхтоўкі сена для грамадскай жывёлы ўзраслі толькі на 9 працэнтаў, а сіласу — нават зменшыліся. Гэтыя лічбы гавораць аб сур'ёзных хібах у рабоце калгасаў і саўгасаў па забеспячэнні жывёлы кармамі.

Нам неабходна ўважліва разгледзець становішча з пагалоўем усіх відаў жывёлы. У некаторых гаспадарках мала клапоцяцца аб павелічэнні пагалоўя, дапускаецца скарачэнне колькасці жывёлы. Гэта нездаровая, няправільная тэндэнцыя. У цяперашніх умовах нам неабходныя як усямернае павышэнне прадукцыйнасці, так і рост пагалоўя жывёлы і птушкі.

Нельга прызнаць нармальным і такое становішча, калі частка гаспадарак, спецыялізуючыся на вытворчасці якога-небудзь аднаго віду жывёлагадоўчай прадукцыі, згортвае вытворчасць іншых прадуктаў, хоць ёсць усе ўмовы для развіцця дзвюх, а то і трох галін. Такія гаспадаркі з вытворцаў нярэдка ператвараюцца ў спажыўцоў, купляюць прадукты жывёлагадоўлі на старане.

Вядома, наш далейшы шлях — гэта спецыялізацыя гаспадарак, усямернае развіццё вытворчасці прадуктаў на прамысловай аснове. Але нельга ў пытаннях спецыялізацыі ўпадаць у крайнасці, пераскокваць праз этапы.

Мы разлічваем, што калгасы і саўгасы, абапіраючыся на дапамогу дзяржавы, прымуць больш дзейсныя меры для ліквідацыі недахопаў у жывёлагадоўлі і павялічаць вытворчасць прадуктаў.

Карыстаючыся тым, што тут прысутнічаюць сакратары ЦК Кампартый рэспублік, абласных і краявых камітэтаў партыі, сакратары райкомаў партыі і пярвічных партарганізацый калгасаў, старшыні Саветаў Міністраў рэспублік, міністры сельскай гаспадаркі, старшыні аблвыканкомаў і крайвыканкомаў, хацелася б сказаць, што яны таксама павінны зрабіць сур'ёзныя вывады і прыняць неабходныя меры да павелічэння пагалоўя жывёлы і росту яе прадукцыйнасці.

Мы таксама маем на ўвазе ў бліжэйшы час разгледзець шэраг пытанняў, звязаных з уздымам гэтай галіны. Да іх ліку адносяцца перш за ўсё такія пытанні, як расшырэнне вытворчасці машын і механізмаў, перавод вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі на прамысловую аснову, далейшае развіццё камбікармавай прамысловасці.

Відаць, трэба таксама разгледзець эканамічны бок пытанняў, звязаных з павелічэннем пагалоўя жывёлы і вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі, захоўваючы, вядома, пры гэтым інтарэсы калгасаў, саўгасаў і дзяржавы.

Адной з галоўных умоў паскоранага развіцця сельскай гаспадаркі з'яўляецца навукова-тэхнічны прагрэс у гэтай галіне. Тэхнічнае пераўзбройванне сельскай гаспадаркі — гэта клопаты не толькі працаўнікоў вёскі. У развіцці прадукцыйных сіл калгасаў і саўгасаў нязмерна ўзрасла роля навукі і прамысловасці.

Трактарнае, сельскагаспадарчае і меліярацыйнае машынабудаванне, хімічная і будаўнічая індустрыя, а таксама перапрацоўчая прамысловасць у многім вызначаюць узровень і эфектыўнасць вытворчасці ў земляробстве і жывёлагадоўлі. Таму патрабаванні да прамысловасці, якая працуе на патрэбы сельскай гаспадаркі, павінны быць значна павышаны.

Вялікія задачы ў галіне сельскай гаспадаркі стаяць перад сельскагаспадарчай навукай. Калгасам і саўгасам патрэбны высокаўраджайныя гатункі і добрыя пароды жывёлы, эфектыўныя спосабы барацьбы з хваробамі раслін і жывёлы, прагрэсіўная тэхналогія вытворчасці і больш дасканалыя метады яе арганізацыі. Трэба ўзмацніць увагу да пытанняў эканомікі калгаснай і саўгаснай вытворчасці.

Савецкая навука, у тым ліку вучоныя, якія працуюць у галіне земляробства і жывёлагадоўлі, маюць выдатныя дасягненні. І мы ўпэўнены, што нашы вучоныя будуць яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні задач па ўздыму сельскай гаспадаркі.

Навукова-тэхнічны прагрэс у сельскай гаспадарцы нельга зводзіць толькі да росту паставак новых машын, хімічных угнаенняў і іншых сродкаў вытворчасці. Неад'емная, актыўная частка гэтага працэсу заключаецца ва ўменні эфектыўна, з найбольшай аддачай выкарыстоўваць зямлю і ўгнаенні, кожную машыну і кожны рубель, укладзены ў вытворчасць. І тут усё, у першую чаргу, залежыць ад вас, таварышы, ад працоўнай актыўнасці і арганізаванасці ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі.

Аналіз дзейнасці калгасаў і саўгасаў паказвае, што ў многіх раёнах ужо пры цяперашнім узроўні матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння гаспадарак ураджайнасць збожжа, бавоўны, цукровых буракоў, бульбы, гародніны, кармавых і іншых культур можа і павінна быць значна вышэйшай, чым фактычная.

Далёка не ўсе гаспадаркі ўжываюць сучасную тэхналогію вытворчасці, эфектыўна выкарыстоўваюць машыны, угнаенні, дасягненні навукі і перадавой практыкі. Не ўсюды належным чынам арганізуюць працу калгаснікаў і работнікаў саўгасаў.

Сур'ёзнай увагі патрабуе падрыхтоўка кадраў масавых прафесій, здольных выконваць на высокім узроўні ўсе работы, звязаныя з эксплуатацыяй новай тэхнікі, укараненнем хіміі, развіццём меліярацыі. За апошнія гады праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы гэтых кадраў для сельскай гаспадаркі. Аднак у шэрагу гаспадарак іх не хапае, значная частка тэхнікі працуе толькі ў адну змену. Вы просіце павялічыць пастаўку тэхнікі. І гэта просьба зусім законная. Але для новай тэхнікі трэба рыхтаваць новыя кваліфікаваныя кадры.

Кожны калгас і саўгас павінен своечасова і планамерна рыхтаваць механізатараў і іншых спецыялістаў, мець поўны рэзерв гэтых кадраў, клапаціцца аб стварэнні для іх неабходных вытворчых і бытавых умоў.

Трэба дабіцца такога становішча, каб тэхніка не стаяла ў чаканні кадраў, каб справа хімізацыі і меліярацыі зямель знаходзілася ў руках падрыхтаваных людзей.

У вырашэнні гэтай агульнадзяржаўнай задачы важную ролю можа і павінен адыграць камсамол. Ён не раз быў пачынальнікам добрых спраў, горача адгукаўся на заклікі партыі. Камсамол акажа калгасам і саўгасам неацэнную дапамогу, калі разгорне рух моладзі за авалоданне сельскімі тэхнічнымі прафесіямі.

Можна быць упэўненымі, што камсамол возьмецца за гэту справу і ў самым недалёкім будучым тысячы камсамольцаў і моладзі сядуць на трактары, камбайны, аўтамабілі, стануць меліяратарамі, электрыкамі, механізатарамі жывёлагадоўчых ферм. Гэтым, таварышы камсамольцы, вы акажаце вялікую дапамогу нашай партыі і народу.

Міністэрству асветы СССР разам з Міністэрствам сельскай гаспадаркі СССР і іншымі органамі трэба таксама падумаць, як дапамагчы калгасам і саўгасам у падрыхтоўцы механізатараў і іншых спецыялістаў з навучэнцаў старэйшых класаў сярэдніх школ.

У сувязі з навукова-тэхнічным прагрэсам у сельскай гаспадарцы цяпер усё большае практычнае значэнне набывае праблема кааперавання сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў. Нагадаю, што гэта пытанне пастаўлена ў Праграме партыі, дзе сказана, што паступова, у меру эканамічнай мэтазгоднасці ўзнікнуць «аграрна-прамысловыя аб'яднанні, у якіх сельская гаспадарка арганічна спалучаецца з прамысловай перапрацоўкай яе прадукцыі, пры рацыянальнай спецыялізацыі і каапераванні сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў».

Трэба сказаць, што на прынцыпах аграрна-прамысловых комплексаў пачынае працаваць шэраг спецыялізаваных саўгасаў і калгасаў у Краснадарскім краі, на Украіне і ў Малдавіі.

Аграрна-прамысловыя аб'яднанні, безумоўна, маюць вялікую будучыню. Гэта не толькі новая арганізацыйная форма, але і важная сацыяльна-эканамічная з'ява. Мы павінны практычна ўзяцца за гэту справу, засцярогшы сябе ад памылак і недастаткова прадуманых, паспешлівых рашэнняў.

Непасрэдныя адносіны да выканання намечанай намі праграмы развіцця сельскай гаспадаркі маюць пытанні сацыяльна-бытавога і культурнага будаўніцтва ў вёсцы. Аб гэтым мы гаварылі на XXIII з'ездзе і Пленумах Цэнтральнага Камітэта партыі, і за апошнія гады ў гэтым напрамку зроблена нямала. У вёсках пабудавана шмат жылых дамоў, школ, клубаў, бальніц, гандлёвых і бытавых прадпрыемстваў. Значна расшырыліся работы па газіфікацыі і завяршэнні электрыфікацыі вёсак.

Але сельскае будаўніцтва пакуль што вядзецца не ў такіх маштабах, як хацелася б. Запатрабаванні сельскіх жыхароў у гэтых адносінах з году ў год растуць, і таму наш агульны абавязак заключаецца ў тым, каб адшукваць рэсурсы і паўней забяспечваць сельскія будоўлі ўсім неабходным, палепшыць забеспячэнне вёскі цэментам, металам, лесам, дахавым матэрыялам, шклом, выдзяляць больш абсталявання для вырабу цэглы і іншых мясцовых будаўнічых матэрыялаў.

Самі калгасы таксама павінны больш актыўна працаваць у гэтым напрамку. Тады добраўпарадкаванне і будаўніцтва культурных устаноў у вёсцы мы маглі б значна паскорыць.

Як бачыце, перад калгасамі і саўгасамі краіны стаяць вялікія і вельмі важныя задачы. Няма сумнення, што калгаснікі і ўсе работнікі сельскай гаспадаркі прыкладуць усе намаганні і дабʼюцца павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў.

Таварышы! Цяпер у вёсцы жывуць і працуюць больш як 5 мільёнаў камуністаў, больш як 8 мільёнаў камсамольцаў і 15 мільёнаў членаў прафсаюза. У нас цяпер няма ніводнага калгаса, ніводнага саўгаса, дзе б не было партыйнай арганізацыі. Камуністы з'яўляюцца прызнаным авангардам сельскіх працаўнікоў, служаць прыкладам у барацьбе за далейшы ўздым калгаснай і саўгаснай вытворчасці.

Усю гэту велізарную армію камуністаў, камсамольцаў і членаў прафсаюзаў аб'ядноўваюць і ўзначальваюць сельскія пярвічныя партыйныя арганізацыі і раённыя камітэты партыі. Яны актыўныя праваднікі лініі партыі, баявыя арганізатары мас.

Цэнтральны Камітэт спадзяецца, што партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі сваёй палітычнай і арганізатарскай работай забяспечаць паспяховае выкананне вялікай праграмы развіцця нашай сельскай гаспадаркі.

Таварышы! Хацеў бы спыніцца на двух пытаннях, якія ўзнімаліся на многіх сходах калгаснікаў.

Як вы ведаеце, за апошнія гады мы ажыццявілі шэраг буйных сацыяльных мер, такія, як пенсійнае забеспячэнне калгаснікаў, гарантаваная аплата працы і іншыя. Цяпер выказваюцца прапановы аб увядзенні адзінай сістэмы сацыяльнага страхавання калгаснікаў з адлічэнняў калгасаў. Гэта прапанова, нам думаецца, заслугоўвае ўвагі з'езда. Яна датычыць мільёнаў калгаснікаў.

У ходзе абмеркавання праекта новага Прыкладнага Статута выказваліся таксама пажаданні аб стварэнні знізу даверху выбарных саветаў калгасаў з мэтай далейшага развіцця калгаснай дэмакратыі, калектыўнага абмеркавання найбольш важных пытанняў іх дзейнасці, абагульнення вопыту арганізацыі вытворчасці і выпрацоўкі рэкамендацый па больш поўным выкарыстанні рэзерваў росту грамадскай гаспадаркі.

Саветы калгасаў, выбраныя з найбольш вопытных старшынь калгасаў, перадавікоў вытворчасці, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, могуць адыграць вялікую ролю ў вырашэнні задач, якія стаяць перад калгасамі.

Калі з'езд прызнае мэтазгодным стварэнне такіх саветаў, то можна было б тут жа выбраць саюзны савет калгасаў.

Таварышы!

У далейшым уздыме сельскай гаспадаркі і развіцці калгаснага ладу велізарную ролю заклікан адыграць новы Прыкладны Статут калгаса, які вам трэба будзе абмеркаваць.

Я не буду падрабязна спыняцца на характарыстыцы асаблівасцей новага Статута. Гэта зробіць у сваім дакладзе член Палітбюро ЦК КПСС таварыш Д. С. Палянскі.

Хачу толькі падкрэсліць, што прыняцце новага Статута, распрацаванага пры калектыўным удзеле шырокай грамадскасці нашай краіны і перш за ўсё саміх калгаснікаў, адкрывае новыя магчымасці для ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці і павышэння актыўнасці калгасных мас.

Пытанне аб новым Статуце — гэта пытанне вялікага палітычнага значэння. Гаворка ідзе, гэта можна сказаць з поўнай падставай, аб новым этапе ў развіцці калгасаў. Прыняцце Статута з'явіцца таксама важнай вяхой у развіцці ўсёй нашай сацыялістычнай дэмакратыі, новым сведчаннем яе глыбока народнага характару, яе неаспрэчных пераваг.

Ранейшы Прыкладны Статут калгаса натхняў і накіроўваў дзейнасць калгасаў у гады станаўлення і развіцця сацыялізма ў нашай краіне. Новы Прыкладны Статут стане законам жыцця і працы калгаснага сялянства ў перыяд будаўніцтва камуністычнага грамадства ў СССР.

Дарагія таварышы! Усю сваю энергію наша партыя і народ прысвячаюць справе стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, далейшаму развіццю грамадскіх адносін, камуністычнаму выхаванню людзей, словам, задачам будаўніцтва камуністычнага грамадства. Наколькі шпарка і паспяхова мы зможам вырашаць гэтыя задачы, у многім залежыць і ад знешніх умоў, у якіх усім нам даводзіцца жыць і працаваць, ад абстаноўкі на міжнароднай арэне. Натуральна таму, што пытанні міжнароднай палітыкі пастаянна патрабуюць вялікай увагі.

У міжнародных справах Камуністычная партыя Савецкага Саюза, яе Цэнтральны Камітэт і наш Савецкі ўрад паслядоўна і непахісна ажыццяўляюць курс, завешчаны нам вялікім Леніным. Мы настойліва змагаемся за ажыццяўленне знешнепалітычнай праграмы, адобранай XXIII з'ездам КПСС.

Наша знешняя палітыка — гэта заўсёды і нязменна палітыка ўмацавання і развіцця брацкай дружбы і ўсебаковага супрацоўніцтва сацыялістычных дзяржаў, іх баявога саюза, іх сумеснай барацьбы за ўмацаванне пазіцый сацыялізма і забеспячэнне мірных умоў для развіцця нашых краін.

Наша знешняя палітыка — гэта заўсёды і нязменна палітыка салідарнасці і саюза з рэвалюцыйнымі, антыімперыялістычнымі, вызваленчымі, прагрэсіўнымі і міралюбівымі сіламі ва ўсім свеце.

Наша знешняя палітыка — гэта заўсёды і нязменна палітыка барацьбы за трывалы мір, за мірнае суіснаванне і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж усімі дзяржавамі, незалежна ад іх грамадскага ладу. Мэтам дасягнення трывалага міру, змяншэння пагрозы сусветнай ракетна-ядзернай вайны служыць і настойлівая барацьба Савецкага Саюза за заключэнне Дагавору аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі, які ўчора быў ратыфікаваны Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР.

І іменна таму, што наша знешняя палітыка ёсць палітыка міру, яна разам з тым заўсёды і нязменна ёсць палітыка рашучай барацьбы з агрэсіяй, палітыка выкрыцця і зрыву небяспечных задум і авантур імперыялістычных падпальшчыкаў вайны, душыцеляў свабоды народаў.

Змагаючыся за мір і дружбу паміж народамі, мы ніколі не забываем аб небяспецы, якой з'яўляецца авантурыстычная палітыка ворагаў міру.

ЦК партыі і ўрад нашай краіны робяць усё, каб наша абарона была заўсёды магутнай і надзейнай, каб слаўныя Узброеныя Сілы Савецкага Саюза мелі ўсё неабходнае для надзейнага забеспячэння бяспекі нашай краіны, для таго, каб разам з нашымі братамі і саюзнікамі — сацыялістычнымі дзяржавамі надзейна абараніць інтарэсы вялікага сацыялістычнага супольніцтва.

Такі ў самых агульных рысах сэнс таго курсу, якога мы прытрымліваемся ў міжнародных справах. Гэты курс нашай партыі і Савецкага ўрада карыстаецца аднадушнай, гарачай падтрымкай усяго савецкага народа.

Нашу палітыку падтрымліваюць і падзяляюць нашы саюзнікі — брацкія сацыялістычныя краіны. Яе актыўна падтрымліваюць і адабраюць нашы аднадумцы і саратнікі па рэвалюцыйнай барацьбе — камуністы зарубежных краін.

Гэта асабліва пераканаўча паказала праходзіўшая ў Маскве летам гэтага года міжнародная Нарада камуністычных і рабочых партый, удзельнікі якой горача і сардэчна гаварылі аб велізарнай ролі, якую адыгрывае ў сусветнай рэвалюцыйнай вызваленчай барацьбе народаў Савецкі Саюз і яго ленінская Камуністычная партыя.

Усе сумленныя людзі на зямлі, усе, каму дорага справа міру і прагрэсу чалавецтва, высока ацэньваюць палітыку СССР як важнейшы фактар падтрымання ўсеагульнага міру.

Міжнароднае становішча нашай краіны моцнае і надзейнае, таварышы. У знешняй палітыцы мы дабіліся немалых поспехаў. Пазіцыі сіл сацыялізма, свабоды і міру няўхільна мацнеюць ва ўсім свеце. Партыя і ўрад робяць усё, каб савецкія людзі маглі спакойна і ўпэўнена працаваць, выконваючы сваю гістарычную місію будаўнікоў камунізма.

Таварышы! Камуністычная партыя, савецкі народ ганарацца выдатнымі справамі працаўнікоў і працаўніц вёскі. Калгаснае сялянства, рабочыя саўгасаў і спецыялісты сельскай гаспадаркі заўсёды праяўлялі высокі патрыятызм, палітычную сталасць, самаадданасць і бяспрыкладную працавітасць.

Наперадзе ў нас шмат новых і вялікіх задач. Мы будуем камуністычнае грамадства, неадступна ідзём да намечанай мэты. Камуністычная партыя добра ведае, што працаўнікі вёскі разам з рабочым класам і інтэлігенцыяй аддадуць усе свае сілы, вопыт і веды, свой рэвалюцыйны энтузіязм ажыццяўленню велічных задач камуністычнага будаўніцтва.

Дазвольце мне ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза яшчэ раз выказаць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што работа і рашэнні III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў паслужаць справе далейшага ўмацавання калгаснага ладу, уздыму ўсёй нашай сацыялістычнай эканомікі.

Вялікіх поспехаў у рабоце вашага з'езда! Вялікага вам асабістага шчасця, дарагія таварышы!

□

Дазвольце, таварышы, зачытаць прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР Трэцяму Усесаюзнаму з'езду калгаснікаў.

(Прамова таварыша Л. І. Брэжнева была выслухана з вялікай увагай і неаднаразова перапынялася апладысментамі).

НЯМЕЦКІЯ ГОСЦІ Ў БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У Мінску знаходзяцца намеснік загадчыка аддзела савецкіх літаратур выдавецтва «Фольк унд Вельт» Ральф Шрэдэр і рэдактар беларускай літаратуры гэтага ж выдавецтва Моніка Шэтлер. Яны прыехалі ў нашу краіну па запрашэнні Саюза пісьменнікаў СССР. Па дарозе ў Маскву госці з ГДР спыніліся на некалькі дзён у сталіцы Беларусі. Мэта іх прыезду ў Мінск—вырашэнне пытанняў, звязаных з выданнем у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы анталогіі беларускага апавядання, а таксама ўмацаванне і далейшае пашырэнне кантактаў і творчых сувязей паміж літаратарамі Савецкай Беларусі і дзяржавы нямецкіх рабочых і сялян.

За дні знаходжання ў Мінску госці з ГДР мелі сяброўскія гутаркі і сустрэчы ў Саюзе пісьменнікаў БССР, у рэдакцыі часопіса «Полымя», у выдавецтве «Беларусь», у Дзяржаўным камітэце Савета Міністраў БССР па друку, пазнаёміліся з выдатнасцямі нашай сталіцы.

Фота Ул. КРУКА.

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ЧАС ПРАД'ЯЎЛЯЕ ВЫСОКІЯ ПАТРАБАВАННІ

ДАКЛАД НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР ПА КІНЕМАТАГРАФІІ, ДЫРЭКТАРА СТУДЫІ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» У. ІВАНОЎСКАГА НА ПЛЕНУМЕ САЮЗА КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ БССР

У ЗНАМЯНАЛЬНЫЯ дні, калі ўвесь савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, сабраліся на свой пленум беларускія кінематаграфісты. На пленуме ішла гаворка аб тым, што зроблена калектывам студыі «Беларусьфільм» у час падрыхтоўкі да вялікага юбілею, як працавала студыя апошнія два гады, як увасабляюцца на экране бессмяротныя ленінскія ідэі, гераічная гісторыя нашай сацыялістычнай дзяржавы, сённяшні дзень.

З дакладам выступіў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі, дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» У. Іваноўскі.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі, у якіх прынялі ўдзел першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР, народны артыст СССР У. Корш-Саблін, кінакрытыкі А. Красінскі, В. Нячай, Е. Бондарава, рэжысёры А. Ястрабаў, У. Стральцоў, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР І. Вейняровіч, заслужаная артыстка БССР Т. Аляксеева, артысты Н. Жукоўская, Л. Румянцава, мастацкі кіраўнік творчага аб'яднання тэлевізійных фільмаў студыі «Беларусьфільм» А. Карпаў, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі Б. Паўлёнак.

На пленуме выступіў загадчык аддзела культуры ЦК КПБ С. Марцэлеў.

Падрабязная справаздача аб спрэчках — у наступным нумары.

„БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» — адно з буйнейшых кінапрадпрыемстваў краіны. 45 гадоў беларускае кіно служыць савецкім людзям. Удзельнічаючы ў многіх здзяйсненнях народа, асэнсоўваючы яго дзеянні і подзвігі ў мастацкіх і дакументальных вобразах, яно імкнецца быць на передавых пазіцыях у барацьбе за пабудову камуністычнага грамадства.

Як працавалі майстры і творчая моладзь нашай кінастудыі летась і сёлета?

Шлях да вялікага мастацтва ў розных мастакоў бывае розны, далёка не заўсёды роўны і лёгкі, і прыносіць ён не толькі радасці і перамогі, але і засмучэнні і няўдачы. Гэта, зразумела, не азначае, што мы загадзя можам планаваць пэўны працэнт поспехаў і прыкрых недахопаў. Нельга запланаваць пяць шэдэўраў у год, але пяць фільмаў з пяці запланаваных мы выпускаць абавязаны.

Бывае так, што мы вымушаны былі паспешліва мяняць планавыя паказчыкі, бо сцэнарная рэдакцыйная калегія не мела паўнацэнных у ідэйна-мастацкіх адносінах сцэнарыяў. Летась мы закончылі фільмы «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка», «Годны да нестраявой», «Іван Макаравіч», «Дзесятая частка шляху», «Вайна пад стрэхамі».

Першы з гэтых фільмаў павінен быў расказаць аб жыцці беларусаў у далёкім мінулым, паказаць адвечнае імкненне нашых продкаў да свабоды, іх барацьбу супраць прыгнятальнікаў.

Пры ўсіх недахопах сцэнарыя (аўтар У. Караткевіч) ён дазваляў пастаноўшчыку шырока выкарыстоўваць магчымасці кінамовы для драматычнага раскрыцця падзей, у якіх масы сялян і гараджан, выступаючы як стыхійная сіла, больш нагадвалі позні сялянскія паўстанні пад кіраўніцтвам Балотнікава, Разіна, Пугачова. Рэжысёр-пастаноўшчык фільма В. Бычкоў з дапамогай аператара А. Забалоцкага здолеў намаляваць яркія сцэны, выдатна, з настроем паставіць батальныя і некаторыя жанравыя эпізоды, але, на жаль, не здолеў паказаць цэльных цікавых характараў. Адбылася звычайная ў такіх выпадках дэвальвацыя жанру: замест гістарычнага твора мы атрымалі павярхоўныя, маламастацкія сцэны, расстаўленыя з улікам логікі кінематаграфічнага мантажу.

Гэта была крыўдная няўдача здольнага рэжысёра.

Яшчэ адным фільмам мінулага года была ваенная стужка «Годны да нестраявой». Вайна ўвайшла ў свет савецкага чалавека груба, жорстка. Але страшныя падзеі тых гадоў толькі больш ярка выявілі духоўнае харaство нашых салдат. Студыя намелася клопату з нявопытнымі пастаноўшчыкамі гэтага фільма В. Рогавым і Я. Сявелам, але здолела аказаць ім актыўную дапамогу. Карціна мае поспех у гледачоў: яе прагледзела ўжо 22 мільёны гледачоў.

Цёпла была сустрэта і стужка Ігара Дабралюбава «Іван Макаравіч». Пакуль гэта лепшая работа маладога рэжысёра. Хацелася б спадзявацца, што фільм, які ён зараз здымае, — «Шчаслівы чалавек», па сцэнарыі Ф. Конева — будзе новай прыступкай на творчай лесвіцы І. Дабралюбава.

Вялікія надзеі ўскладалі мы на фільм «Дзесятая частка шляху», пастаўлены рэжысёрам Ю. Дубровіным. Бо галоўнай тэмай, якая натхняе савецкіх кінематаграфістаў, была і застаецца сучаснасць, духоўны свет і духоўныя подзвігі будаўнікоў камуністычнага грамадства. Добрасумленнае пераладжэнне на мову кіно аднайменнай аповесці П. Межарыцкага дазволіла б убачыць на экране карціны з жыцця цікавых нашых сучаснікаў, дало б адчуць іх клопаты і трывогі. Гэтага не адбылося.

Чаму фільм атрымаўся вялым, быццам з яго выпусцілі кроў, пакінуўшы яе столькі, колькі трэба для клінічнага існавання, а не актыўнага жыцця? Перад запускам фільма рэжысёр гаварыў, што ён спіць і бачыць гэты сцэнарый. Потым пачаліся эксперыменты. Спачатку ампутавалі тое, што здалося лішнім. Потым тое, што было адарвана ў хірургічным запале, спакваля аднаўлялася. Пасля рашылі памяняць сваяцкія сувязі дзеючых асоб, бо ў сцэнарый трапіў персанаж, які даводзіўся дзядзькам гераіні і яе брату і які быў першым сакратаром райкома партыі. Мастацкі кіраўнік студыі і рэжысёр фільма вырашылі, што дзядзька на пасадзе сакратара райкома — з'ява «нетыповая», і таму з дзядзькі зрабілі цётку, захаваўшы за ёю пасаду, але катэгарычна забараніўшы ёй мець сваякоў.

Рэжысёр Ю. Дубровін няўдала вырашыў праблему падбору акцёраў. У выніку ўсяго гэтага карціна мае, як кажуць, сціплы поспех у гледачоў, хоць у ёй і ёсць вельмі важная тэма і некаторыя рэжысёрскія знаходкі.

Такія вынікі вытворчасці фільмаў 1968 года, вынікі, у якіх выявілася галоўная слабасць «Беларусьфільма» — недастатковая патрабавальнасць рэжысёраў, гатоўнасць мірыцца з малым творчым патэнцыялам прафесіянальна слабых пастаноўшчыкаў. На жаль, на студыі не прааналізавалі прадукцыю мінулага года, а такі аналіз мог быць, безумоўна, карысным.

З пяці мастацкіх фільмаў гэтага года тры ўжо выйшлі на экраны, вытворчасць двух астатніх заканчваецца.

Першым быў закончаны фільм «Чакай мяне, Ганна!» Сцэнарый Ю. Нагібіна тонкі, цікавы. Добрыя былі і намеры рэжысёра-пастаноўшчыка В. Вінаградава — стварыць маштабны твор. Аднак правільна ўзнавіць атмасферу дзеяння, дакладна выверыць ідэйныя акцэнты твора, не дапусціць безгустоўшчыны рэжысёр не здолеў.

Фільмы «Створы бой!» і «Мы з Вулканам» ставілі маладыя рэжысёры М. Калінін і В. Пяроў. Гэта былі іх першыя самастойныя работы. У выніку — мы атрымалі ў асобе М. Калініна, безумоўна, патрабавальнага, думаючага рэжысёра. Дарэчы, абодвум пастаноўшчыкам аказаў вялікую прафесіянальную і творчую дапамогу У. Корш-Саблін. Вялікае яму за гэта дзякуй!

Астатнія дзве карціны — «Я, Францыск Скарына», «Сыны ідуць у бой» — яшчэ ў рабоце, але ўжо зараз можна сказаць, што гэта будуць цікавыя творы, здольныя падтрымаць добрыя адносіны гледачоў да нашай студыі.

Да юбілейнай даты, 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, рыхтуюцца зараз ва ўсім свеце і асабліва старанна ў нашай краіне. Чым беларуская мастацкая кінематаграфія адзначыць юбілейны год?

Хутка У. Корш-Саблін пачне ў Ленінградзе здымкі фільма «Крушэнне імперыі». Гэта будзе першы ў савецкай кінематаграфіі твор аб Лютаўскай рэвалюцыі.

Рэжысёр А. Спешнеў паспяхова заканчвае здымкі фільма «Чорнае сонца», прысвечанага барацьбе супраць неакаланіялістаў. Ужо дзве трэці карціны зманціраваны. Матэрыял абяцае цікавы, эмацыянальна насычаны мастацкі твор.

Некалькі слоў аб сцэнарнай праблеме.

Фільмы плана 1970 года ўжо забяспечаны зацверджанымі сцэнарыямі. Нядрэнна складваецца план 1971 года. Намечана выпусціць па два фільмы сучаснай тэматыкі, дзіцячыя і ваенна-патрыятычныя фільмы. На студыі складзены праект тэматычнага плана па ўсіх творчых аб'яднаннях. Можна сказаць, што мы не адчуваем недахопу ў новых цікавых тэмах. Але вось праблема высокай якасці сцэнарыяў застаецца. На гэтай асноўнай праблеме і павінна быць засяроджана ўвага сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі.

Ніхто і ніколі не можа ўдыхнуць жывую душу ў твор, калі мастак не здольны асэнсаваць і абагульніць з'явы рэчаіснасці і перакласці факты жыцця на мову вобразаў, калі творы з'яўляюцца плёнам павярхоўнага роздуму. З першых крокаў рэжысёру павінен спадарожнічаць добры і патрабавальны друг — рэдактар. На жаль, у нас рэжысёр не заўсёды мае побач такога друга.

Мы павінны ўсе разам — кінадраматургі, рэжысёры, аператары, рэдактары, адміністрацыйныя работнікі — стварыць абстаноўку нецярпімасці да шэрасці, ідэйнай няпэўнасці, прымітывізму.

ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ кіно заклікана выяўляць сваю мастацкую сутнасць назіраннем за штодзённым жыццём, за актуальнымі падзеямі і паваротнымі з'явамі нашых дзён, за тым, як раскрываецца і праяўляецца ў гэтых падзеях наш савецкі чалавек — творца новага свету, новага грамадства.

Нездарма гавораць, што рух народных мас ва ўсёй яго складанасці і шматаблічнасці, сацыяльныя схваткі і рэвалюцыйныя буры — гэта хлеб і паветра савецкага дакументальнага кіно, з гэтым звязаны яго буйнейшыя перамогі і дасягненні.

Паспрабуем разгледзець работу творчага аб'яднання «Летапіс». Перш за ўсё, вядома, трэба спыніцца на ўдзеле нашых дакументалістаў у стварэнні навукова-дакументальнай кіналенініяны.

Рэжысёр Пётр Аліфярэнка і аператар Уладзімір Цяслюк знялі фільм «Барацьба і творчасць» — пра Панцеляймона Лепяшынскага, прафесіянальнага рэвалюцыянера, віднага дзеяча Камуністычнай партыі, вучонага і літаратара. Лепяшынскі пражыў цікавае, вялікае і працоўнае жыццё. І тут можна звесці ўвесь фільм да пераказу біяграфіі рэвалюцыянера. Але рэжысёр пайшоў іншым шляхам. Ён шукае вытокі мужнасці Лепяшынскага, вытокі яго рэвалюцыйнай страснасці і стойкасці.

Гэты пошук рэжысёр П. Аліфярэнка прапанаваў і ў другім фільме — «Браты Бонч-Бруевічы». Гэта фільм аб «славутых Бонч-Бруевічах», як іх назваў Ленін, — пра Уладзіміра Бонч-Бруевіча і яго брата, былога царскага генерала, а пазней буйнага савецкага военачальніка Міхаіла. У распараджэнні рэжысёра быў абмежаваны матэрыял — некалькі фатаграфій і зусім мала хронікі. Гэты матэрыял ён пастараўся выкарыстаць так, каб як мага глыбей пранікнуць у характары гістарычных асоб, і дабіўся поўных поспехаў. Менш удалося рэжысёру пранікнуць у духоўна-маральную атмасферу эпохі, узнавіць канкрэтна-гістарычныя дэталі.

Нядаўна закончыў работу над фільмам «На галоўнай плошчы» рэжысёр Вадзім Сукманаў. Не ўсё ўдалося яму ў гэтым фільме, не ўсё атрымалася і ў аператара Ул. Цяслюка-малодшага. Аднак галоўная думка карціны — плошча Леніна ў Мінску, плошча народаўладдзя і навукі ўвасабляе сённяшнюю Беларусь, сімвалізуе перамогу неўміручых ленінскіх ідэй — гэта думка знайшла на экране даволі пераканаўчае выяўленчае рашэнне.

Знамянальнай даце нашага часу — ленінскаму стагоддзю — прысвечаны многія фільмы нашых дакументалістаў. Так, заканчваецца работа над фільмам «Там, за ракой — Дзяржынава» (рэжысёр Ч. Цяўлоўскі, сцэнарый Анатоля Вялюгіна). Гэта будзе фільм аб каханні і Радзіме, аб непахіснай вернасці «жалезнага Фелікса» справе рэвалюцыі, справе ленінізма, аб яго сябрах і ворагах.

Здымаюць карціну «Толькі адна тэлеграма» рэжысёр Ю. Лысятаў і аператар Р. Масальскі. У аснову сцэнарыя гэтага фільма пакладзены цікавы гістарычны факт. У лютым 1918 года старшыня Савета рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў Дрысенскага павета (цяпер Верхнядзвінск, Віцебскай вобласці) паслаў запытанне Старшыні Савета Народных Камісараў, як быць у выпадку наблiжэння немцаў да горада. 19 лютага ў тэлеграме Уладзімір Ільіч адказаў — супраціўляцца, дзе гэта магчыма, разбіраць пуці, узрываць масты, нічога не пакідаць ворагу. Зараз нашы дакументалісты вядуць пошук па слядах гэтай ленінскай тэлеграмы.

Адну з забытых старонак дзейнасці У. І. Леніна павінен узнавіць на экране фільм «Карабель-прывід», які раскажа аб барацьбе Леніна ў часе знаходжання яго ў эміграцыі. Расказаць аб гэтым з экрана бясспрэчна цікава асабліва зараз, калі пытанні міжнароднай салідарнасці працоўных сталі рашаючымі для лёсу міру.

Кінематаграфісты, якія ўдзельнічаюць у стварэнні дакументальных фільмаў, павінны быць патрабавальнымі да сябе. Кожны фільм павінен вызначацца яснасцю партыйнай пазіцыі, арыгінальнасцю творчага мыслення, выразнасцю і праўдзівасцю, публіцыстычнай страснасцю. Без гэтага няма сэнсу брацца за камеру.

Сапраўдны поспех здабываецца глыбокім пранікненнем мастака ў жыццёвы матэрыял. Цікава, што такія фільмы, як «Штрыхі да партрэта», створаны сцэнарыстамі М. Бярозкам і К. Славіным у садружнасці з І. Пікманам, У. Цеслюком, Р. Ясінскім і Ю. Івановым, «Сямёнаўскі гарадок» П. Аліфярэнкі, «Жыве на Палессі чалавек» А. Ястрабава, «Пакараны смерцю ў 41-м...» В. Чацверыкова, атрымалі высокую ацэнку грамадскасці і з поспехам дэманстраваліся ў часе Тыдня беларускага дакументальнага кіно ў Маскве.

Толькі што закончыў працу над поўнаметражным дакументальным фільмам «Пах пораху і хлеба» рэжысёр Іосіф Вейняровіч (сцэнарый В. Панамарова, аператар Э. Гайдук). Гэта фільм пра народнага героя Беларусі Кірылу Пракопавіча Арлоўскага — легендарнага разведчыка, адважнага партызанскага камандзіра, нястомнага арганізатара калгаснага будаўніцтва. Яшчэ рана даваць ацэнку новай рабоце нашых дакументалістаў. Аднак хочацца падкрэсліць імкненне здымачнай групы стварыць на экране вобраз буйны, шматгранны, вобраз чалавека вялікай мужнасці, перакананасці.

Цяжка абмежаваць фільмы аб нашым сучасніку строга вызначанымі рамкамі. У некаторых фільмах, якія здымаліся, здавалася б, аб іншым, удалося стварыць яркія вобразы савецкіх людзей, паказаць іх ва ўсёй непаўторнасці. Напрыклад, фільм Ю. Цвяткова «Песня Палесся» — фільм з этнаграфічным ухілам, у пэўнай меры пастановачны. Аднак, можна не сумнявацца, што гледачы запомнілі і палюбілі героя фільма — старога калгасніка Пракопа Кандратавіча Івашкевіча — чалавека невычарпальнага гумару і жыццялюбства. Нельга не назваць і карціну, знятую рэжысёрам Ю. Лысятавым — «Паляванне са старым сабакам». У гэтым фільме раскрываюцца ўзаемаадносіны чалавека і прыроды, прычым чалавек выступае як носьбіт добрых, мужных якасцей.

За апошнія гады работы нашых дакументалістаў неаднаразова адзначаліся на ўсесаюзных кінафестывалях і зональных аглядах. Сярод адзначаных узнагародамі — «Пакараны смерцю ў 41-м...», «Першыя ноты», «Хірургія на ферме», «Штрыхі да партрэта», «Самагубца», спецвыпуск «Нас вадзіла маладосць». Дыпломамі адзначаны работы аператараў Я. Сакалова — за здымкі фільма «Сапропель» і А. Сіманава — за здымкі фільма «Паляванне са старым сабакам». Фільм «Генерал Пушча» адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Аднак нельга не адзначыць, што ўвасабленне вобраза сучаснага чалавека на экране — справа цяжкая. Яна звязана з пашырэннем стылявога дыяпазону нашых дакументалістаў, з узбагачэннем іх мастацкай палітры, з няспыннымі творчымі пошукамі. І не ўсё тут у парадку, не ўсё добра.

Рэжысёр Ю. Лысятаў, які вельмі цікава заявіў аб сабе ў дакументальным кіно, — яшчэ нядаўна ён здымаў навукова-папулярныя і заказныя фільмы, — сёлета разам з аператарам Р. Масальскім зняў карціну «Паездка ў Кіршы». Гэта кінарасказ аб старой даярцы, якая праз усё жыццё пранесла любоў да родных мясцін, да сваёй нялёгкай прафесіі. Рад эпізодаў гэтага фільма па-сапраўднаму хвалюе. У той жа час нельга не папракнуць стваральнікаў гэтай карціны за тое, што іх гераіні ўласцівыя нейкая пасіўнасць, інертнасць. У карціне шмат сузіральнасці, эцюднасці, любавання другараднымі дэталямі. Усё гэта бясспрэчна зніжае ідэйна-мастацкія якасці гэтай цікава задуманай стужкі.

Рэжысёр В. Дашук, які нядаўна ўдала зняў карціну, прысвечаную 25-годдзю вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, менш паспяхова справіўся з фільмам аб следчым. У гэтым фільме няма чоткай і яснай думкі. Выяўленчы рад аднастайны і невыразны, пакідаюць жадаць лепшага сінхронныя здымкі.

Няўдача спасцігла рэжысёра В. Сукманава, які спрабаваў зняць фільм пра дзяўчыну-работніцу трактарнага завода. Атрымалася так, што гераіні на экране фактычна няма: яна праходзіць бясследна, не выклікаючы ніякіх эмоцый і роздуму. Мусіць, была зроблена памылка і ў выбары гераіні фільма, месца здымак, і ў самым падыходзе да тэмы.

Цяпер сцэнарны аддзел «Летапісу» вядзе работу толькі над тымі сцэнарыямі, якія ўключаны ў тэматычны план. Па меры гатоўнасці гэтых сцэнарыяў яны неадкладна ўключаюцца ў творчы план, і пачынаюцца здымкі фільма. Гэта практыка, здавалася б, найбольш рацыянальная і заканамерная, мае ў сабе рад акалічнасцей, якія перашкаджаюць рабоце па забеспячэнні аб'яднання прафесіянальнымі і высокаідэйнымі сцэнарыямі. Па-першае, план прадугледжвае рад тэм, якія могуць здымацца толькі пры наяўнасці пэўнай натуры. Таму фільмы па гэтых тэмах нават пры наяўнасці гатовых сцэнарыяў не могуць быць запушчаны ў вытворчасць. Не менш важная і другая акалічнасць. Сярод аўтараў, з якімі супрацоўнічае аб'яднанне «Летапіс», мала прафесіянальных сцэнарыстаў. У асноўным гэта — маладыя беларускія літаратары, журналісты, інжынеры. Як правіла, работа над кожным сцэнарыем забірае шмат часу. Звычайна сцэнарыі прымаюцца толькі ў другім або трэцім варыянце, а ў асобных выпадках работу наогул не ўдаецца давесці да канца. Вось і даводзіцца нечым замяняць такія фільмы, своечасова запускаць іншыя. Гэта вядзе да паніжэння патрабавальнасці да якасці сцэнарыяў.

Прымаюцца меры, каб павысіць кваліфікацыю нашых сцэнарыстаў. У канцы 1967 года Рэспубліканскі камітэт па кінематаграфіі разам з Саюзам кінематаграфістаў БССР правёў семінар сцэнарыстаў дакументальнага і навукова-папулярнага кіно. Семінар даў бясспрэчную карысць. Некаторыя яго ўдзельнікі пачалі рэгулярна супрацоўнічаць з аб'яднаннем і я не памылюся, калі скажу, што ад фільма да фільма расце іх прафесіянальнае майстэрства. Зараз, літаральна днямі, павінен пачаць работу новы семінар сцэнарыстаў.

Агульнавядома з тэорыі і практыкі, што спецыфіка кіно абавязвае нас расказваць аб з'явах у жыцці даходліва, пераканаўча, цікава, расказваць, робячы кожнага гледача саўдзельнікам падзей, якія сталі аб'ектам кінематографа. Я падкрэсліваю менавіта гэту асаблівасць кінатворчасці, бо часам мы прымушаем гледача разгадваць кінематаграфічныя галаваломкі.

Самаўпэўненыя мастакі, аматары іерогліфаў не перастаюць гаварыць аб тым, што глядач яшчэ не дарос да разумення мовы сучаснага кінематографа, а вось потым, даспеўшы, так сказаць, да ўзроўню, зразумее сённяшніх занадта разумных кінапісцаў. Наіўны разлік. Мы ўжо бачылі ў апошнія гады нямала карцін, зробленых па прынцыпе: чым больш незразумела, тым разумней. Дзе яны? Хто іх памятае? Талент і яснасць заўсёды ішлі поруч, а шматзначная міна і неўрастэнічны цік на экране ніколі не маглі схаваць пустаты. І чуючы такія довады ў абарону кінематаграфічнага мудрагельства, шкада бывае глядзець на дарослых дзяцей, якія лічаць сябе «наватарамі», але ўсё яшчэ ходзяць у кароткіх штоніках наіўнага дзяцінства ў творчай справе.

Нам непатрэбны творы мастацтва, зразумелыя толькі адзінкам.

ТВОРЧАЕ аб'яднанне тэлевізійных фільмаў — маладое, арганізаванае год таму назад. Гэты год быў годам арганізацыйнага фарміравання калектыву аб'яднання. Быў узяты курс на прыцягненне маладых творчых кадраў, выпускнікоў Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі, дыпломнікаў, каб у выніку адбору ў аб'яднанні стварыць пастаянны творчы калектыў. А гэта неабходна ўжо таму, што план на 1970 год прадугледжвае вытворчасць 10 мастацкіх поўнаметражных фільмаў.

Цяпер у аб'яднанні зарэкамендавалі сябе ў рабоце маладыя спецыялісты — В. Рубінчык, В. Нікіфараў, Б. Аліфер, Э. Садрыеў. Добра дэбютаваў як рэжысёр малады аператар студыі Ю. Цвяткоў.

Фільмы «Белая вежа» (рэжысёр С. Сплашноў), «Беларусь мая сінявокая» (рэжысёр Ю. Цвяткоў), «Чырвоны агітатар Трахім Глушкоў» (рэжысёр В. Рубінчык) атрымалі прызнанне Усесаюзнага камітэта па радыё і тэлебачанні і аднесены да першай катэгорыі.

Аўтары фільма «Белая вежа» А. Вялюгін, С. Сплашноў, і Г. Лейбман стварылі цікавы кінарасказ аб жамчужыне беларускай прыроды — Белавежскай пушчы. Лірычная і задушэўная інтанацыя фільма, здымкі метадам назірання, удала выбраны мастацкі прыём — расказ ад імя самой Белавежскай пушчы — дапамагаюць поўна пазнаёміцца з цудоўным запаведнікам, ацаніць яго непаўторныя выдатнасці.

Фільм «Беларусь мая сінявокая» знаёміць гледачоў з нацыянальным мастацтвам Беларусі. Аўтары фільма Ю. Цвяткоў і аператар Б. Аліфер знайшлі арыгінальнае выяўленчае рашэнне фільма. Фільм выклікае несумненную цікавасць, як расказ аб музычнай мастацкай культуры нашай рэспублікі.

Фільм «Чырвоны агітатар Трахім Глушкоў» (аўтар сцэнарыя В. Пацейкін, рэжысёр В. Рубінчык) — гэта рамантычная навела аб грозных часах грамадзянскай вайны, аб подзвігу юнака-агітатара.

Закончаны здымкі кінакарцін «Сельскія канікулы» і «Бераг прынцэсы Люські». Гэта каляровыя трох- і чатырохчасткавыя фільмы на сучасныя тэмы.

Аб'яднанне вядзе вялікую работу па стварэнні шматсерыйнага фільма аб гераічным мінскім падполлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (аўтары сцэнарыя І. Новікаў, І. Чыгрынаў, рэжысёр В. Чацверыкоў). Група вядзе комплексныя падрыхтоўчыя работы раду аб'ектаў, ідуць пробы акцёраў. Фільм маштабны, шматпланавы, з вялікай колькасцю дзеючых асоб, з выкарыстаннем гістарычнага дакументальнага матэрыялу. Здымкі павінны пачацца ў снежні.

У лістападзе будзе запускацца ў вытворчасць двухсерыйны фільм «Белая зямля» (аўтар сцэнарыя А. Ляонцьеў, рэжысёр А. Карпаў). Гэта фільм аб мужнасці, стойкасці савецкага чалавека, аб яго высокай грамадзянскасці і гуманнасці. У вострай сюжэтнай форме фільм спалучыць два часы: сёння і ўчора, дзень міру і дзень вайны, раскажа аб тым, што ніхто не забыты і нішто не забыта.

Аб'яднанне ўжо цяпер мае аўтарскі актыў, з якім працуе над будучымі фільмамі 1970—71 гадоў. Трэба сказаць, што і тэмы фільмаў будучага года працягваюць напрамак аб'яднання на сучасную тэму. Фільмы бліжэйшага запуску, гэта значыць, першага квартала 1970 года, раскажуць аб нашых сучасніках, аб прадстаўніках рабочага класа, маладой інтэлігенцыі — «Дзень маіх сыноў», «Дзень ды ноч», «Дом на колах». Пра аднаго з герояў народавольчаскага руху раскажа фільм «Домік на Волзе» (аўтар сцэнарыя Л. Руціцкі, рэжысёр А. Булінскі).

Гаворачы аб творчым браку ў рабоце, хочацца коратка расказаць аб гісторыі стварэння тэлевізійнага поўнаметражнага мастацкага фільма «Спяшайся пабудаваць дом». У ходзе абмеркавання яго мастацкім саветам аб'яднання з вядучымі творчымі работнікамі студыі было ўстаноўлена, што зняты матэрыял не адпавядае мастацкім запатрабаванням, мае шмат тэхнічнага браку. Не вызначана стылістыка фільма, не распрацаваны вобразы асноўных персанажаў. Многія сітуацыі зроблены прымітыўна, рад сцэн зняты інфармацыйна, без патрэбнай распрацоўкі і падрыхтоўкі, узровень акцёрскага выканання вельмі нізкі. Аб'екты здымак падабраны непрадумана, без сувязі з ідэйна-мастацкай задумай фільма, рад кадраў засмечаны лішнімі дэталямі. Другі план у большасці кадраў выпадковы. Матэрыял зняты плоска, безгустоўна, без адзінага выяўленчага рашэння.

Такое стала магчымым перш за ўсё таму, што рэжысёр П. Васілеўскі кепска рыхтаваў здымкі, не здолеў стварыць у здымачнай групе неабходнай творчай атмасферы. Творчы склад групы працаваў у стылі недаверу, нядобразычлівасці. Грубыя памылкі і безадказнасць дапусцілі ў сваёй рабоце галоўны аператар Г. Удавенкаў, мастак-пастаноўшчык Б. Кавецкі. Мастацкі савет аб'яднання тэлевізійных фільмаў вызначыў, што здымачная група ў цяперашнім яе складзе не можа забяспечыць працяг работы над фільмам і высокую ідэйна-мастацкую якасць карціны. Дырэкцыя студыі пасля абмеркавання работы здымачнай групы на пасяджэнні партыйнага бюро выдала загад, у якім працяг работы над фільмам даручыла новаму рэжысёру і новаму аператару.

У аб'яднанні вельмі шмат нявырашаных пытанняў як у творчым, так і ў арганізацыйным плане. Яшчэ недастаткова прыцягнуты пастаянныя творчыя кадры, працягваецца пошук форм творчай і арганізацыйнай дапамогі здымачным калектывам. Слабы яшчэ па якасным саставе рэдакцыйны савет, неабходны аб'яднанню для яго перспектыўнай работы. Мусіць, трэба падумаць і над спецыфікай тэлефільмаў, асаблівасцей іх здымак і мантажу. Гэта тэарэтычныя і практычныя пытанні саюзнага значэння, але, мусіць, трэба працаваць над імі і ў нас.

Вядома, прыцягненне маладых сіл да работы над тэлефільмамі — справа складаная, і ў той жа час кароткія тэрміны вытворчасці, значна меншыя сродкі, якія адпускаюцца для вытворчасці тэлефільмаў, дысцыплінуюць калектыў, прымушаюць яго глыбей пранікаць у працэс вытворчасці, вышукваць яе рэзервы і магчымасці. А ўлічваючы, што патрабаванні да якасці фільма ні ў якім разе не зніжаюцца, творчыя калектывы тэлевізійных фільмаў павінны быць узорам творчай энергіі, арганізаванасці і прафесіяналізму.

ВЯЛІКІЯ і адказныя задачы стаяць перад савецкім мастацтвам. Беларускія кінематаграфісты разумеюць свой абавязак і прыкладуць усе намаганні, каб сустрэць знамянальную дату — 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна — новымі творамі розных жанраў, творамі высокай ідэйна-мастацкай вартасці, якой вымагае час, якасці, якой чакаюць ад экраннага мастацтва партыя і народ.

Друкуецца са скарачэннямі.

У ПЕРАПЫНКАХ ПАМІЖ ПАСЯДЖЭННЯМІ

Народны артыст СССР Ул. Корш-Саблін і народны артыст БССР Л. Голуб.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Булінскі і кіназнаўца В. Нячай.

Кінааператары М. Южык, Д. Фрыд і Г. Лейбман.

Кінааператар Ул. Акуліч і кіназнаўцы В. Смаль і А. Красінскі.

Фота Ул. КРУКА.

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ВЯРШЫНІ — НАПЕРАДЗЕ!

Брэсцкаму тэатру імя Ленінскага Камсамола Беларусі — 25 гадоў

Імклівы цягнік «Шапэн» праразае густы бялёсы туман. І пад манатонны грукат так натуральна ліецца гаворка—і яна пра тэатр. Мы едзем у пагранічны Брэст на свята з нагоды 25-годдзя творчай дзейнасці драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Здаецца, гэта было так нядаўна, калі тэатр упершыню прыехаў на гастролі ў Мінск і заваяваў прызнанне сталічнага гледача паюнацку трапяткой сцэнічнай аповесцю «Маладая гвардыя», суровай праўдай чалавечага подзвігу, які быў мастацкім нервам спектакля «Як гартавалася сталь»... А мінула з той пары два дзесяцігоддзі. Здаецца, зусім нядаўна мы з пачцівай павагай, узрушаныя амаль дакументальным мастацтвам, глядзелі на самаахвярных салдат з «Брэсцкай крэпасці», і нас агортваў прасветлены сум па тых, хто стаяў насмерць у цытадэлі над Бугам. А пасля прэм'еры мінула пятнаццаць гадоў!.. Час няспынна ідзе наперад, і тое, што было падзеяй сённяшняга дня, заўтра адыходзіць у гісторыю, робіцца здабыткам летапісцаў. І набліжаюцца гадавіны, як вяхі вялікага творчага шляху, надыходзяць дні роздуму пра створанае, дасягнутае і пра тое, што было зроблена не зусім так, як таго хацелася. Мастацтва тэатра! Тут няма пратаптаных сцежак — кожны артыст пракладае свой след. А тэатр, калектыў творчых аднадумцаў, тым больш...

Чвэрць стагоддзя заўзятай і руплівай сцэнічнай дзейнасці такога тэатра ў Брэсце —дата прыкметная ў культурным жыцці рэспублікі.

— Яны ўмеюць захоўваць полымя непасрэднасці ў спектаклях доўгія гады. Можа быць, якраз такая рыса ў творчасці больш за ўсё і дае гэтаму калектыву права называцца камсамольскім,—гаворыць заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Уладзімір Мацвеевіч Стэльмах.

Яго словы нібы падхоплівае народная артыстка рэспублікі Ірына Фларыянаўна Ждановіч, майстра сцэны выпрабаваны, чыя творчасць можа лічыцца эталонам артыстычнага добрасумлення.

— Непасрэднасць... А што гэта такое ў акцёрскім майстэрстве?—пытаецца яна.— Мабыць, гэта ўменне заставацца самім сабой у праявах нечага істотнага ў чалавеку, якога ты іграеш. Упершыню я адчула, як гэта неабходна нам, у спектаклі «На Купалле» Міхася Чарота ў Першым БДТ. Там была такая сцэна: сяляне на полі паселі снедаць. Дзеляць бохан хлеба. А мы тады жылі галаднавата і таму «накідваліся» на хлеб, як кажуць, па-сапраўднаму. І смачна так елі!.. Зала апладзіравала нам за «праўду», а мы пачыналі разумець, як яна здабываецца, тая мастацкая праўда. Спачатку адчуў у сабе патрэбу нешта зрабіць, а тады... Я кажу гэта трошкі жартам, але і ў вялікім мастацтве, відаць, усё пачынаецца з адпаведнасці жыцця і «ігры»... Помню, як сумавалі мы ў Томску па родным краі, нам, як і Янку Купалу, былі арганічныя словы-споведзь: «Мне сняцца сны аб Беларусі...» Іграем спектаклі пра вайну, і зноў жа нешта асабістае абпальвае твой сцэнічны характар. Нам вераць, нам апладзіруюць. І тут, у сэрцы, нешта зварухнецца: выказаўся...

Ірына Фларыянаўна справядліва гаворыць пра тое, што мастак заўсёды адкрывае для сябе «сакрэты» творчасці на ўласным жыццёвым і артыстычным вопыце. І калі на ўрачыстым пасяджэнні ў Брэсце галоўны рэжысёр тэатра, народны артыст БССР Георгій Волкаў спыняў сваю прамову, каб даць слова пасівеламу цяпер Юрыю Уласаву, а той, хвалюючыся, як на прэм'еры, выйшаў да рампы і прамовіў першыя словы клятвы маладагвардзейцаў: «Я—Алег Кашавой...»—мы ўспомнілі, што некалі ён выступаў як равеснік героя, як яго пабрацім. І калі потым, таксама спыняючы прамову, рэжысёр запрашаў наперад Максіма Абрамава, а той у промні пражэктара чытаў маналог Камісара з «Брэсцкай крэпасці», усе мы, у зале, адчулі, як і сапраўды мастацтва гэтых артыстаў нараджаецца ў арганічнай сувязі з жыццём, што тут, ля руін цытадэлі над Бугам, у цэгле якой прытоена рэха векапомных дзён эпапеі гераізму, рамесніцтва адыходзіць на другі план, саступаючы месца натхнёнаму грамадзянскаму па духу мастацтву.

І потым, калі на сцэну ўзнімаліся прадстаўнікі грамадскіх арганізацый горада і вобласці, пасланцы камсамоліі і піянерыі, калгаснікі і студэнты, будаўнікі і рабочыя брэсцкіх заводаў, часта паўтаралася слова «Дзякуй!». Тэатру дзякавалі за тое, што ён стаў неад'емнай часткай культурнага жыцця Брэстчыны. За тое, што артысты на працягу ўсіх дваццаці пяці гадоў выступаюць і на сваёй сцэне, і на палявых станах, і ў клубах, і ў заводскіх цэхах, і ў студэнцкіх аўдыторыях.

Выбух апладысментаў выклікала і такая салідная лічба, як пяць мільёнаў: так, на спектаклях камсамольскага тэатра пабывала пяць мільёнаў гледачоў!

Я гутару з заслужанай артысткай рэспублікі Ганнай Качатковай, і яна задуменна гаворыць:

— Узрушае да слёз, калі зала ва ўрачыстай цішыні сочыць за героямі Чэхава, пакутуе і змагаецца разам з няўрымслівымі персанажамі горкаўскай драматургіі, успрымае напал шэкспіраўскіх страсцей. Не, тэлебачанне не можа замяніць гэтае свята—сустрэчы жывога акцёра з жывой душой гледача. Ведаеце, я часам з трапяткім неспакоем думаю: ёсць жа сёння ў зале нехта, для каго мы, брэсцкія акцёры, адкрываем таго ж Чэхава, Горкага, Шэкспіра! І калі такі «неафіт» пакіне залу хоць крышку багацейшы на эмацыянальную пісьменнасць, гэта ён нам будзе абавязан радасцю адкрыцця. А калі расчаруецца?.. Тады сорам нам...

А ў фае, падобныя на вырай дзівосных птушак, лёталі і аб чымсьці шапталіся піянеры ў чырвоных гальштуках і пілотках. Я падслухаў. «Не, я не падыду да яго, бо мне не верыцца, што ў жыцці ён такі звычайны дзядзька»,—гаварыла сяброўцы кірпатая дзяўчынка і пазірала на Барыса Уксусава, любімца брастчан. «А гэта—хто?» «Як—хто: Ірына Ждановіч з Мінска, вялікая актрыса, я чытаў пра яе»—разважна прамовіў хлопец з барабанам. «А вунь Аляксей Максімавіч Самараў: гэта яго называюць цяжкім імем ветэран»...Яны былі тут, у тэатры, сваімі людзьмі. І зноў жа з удзячнасцю падумалася, як гэта сапраўды здарова, што на граніцы, ля крэпасці-героя, жывуць дапытлівыя дзеці, атрымліваючы ўрокі характва са сцэны любімага тэатра.

За гадзіну да пасяджэння артысты камсамольскага тэатра паказалі Ірыне Фларыянаўне Ждановіч гаспадарчы склад, дзе захоўваюцца дэкарацыі. Калісьці, на пачатку творчага шляху, яны тут, у гэтым складзе, рэпеціравалі і ігралі першыя свае спектаклі. «Ён для нас, як для мхатаўцаў, вядомы цяпер усяму свету амбар у падмаскоўным дачным мястэчку Пушкіна, дзе нараджаўся тэатр»,—з усмешкай сказаў гасцям Георгій Волкаў.

Іх засталося ў трупе толькі трое — заснавальнікаў тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі — Зінаіда Курдзянок, Юрый Уласаў і Георгій Волкаў. Апошні цяпер узначальвае трупу, кіруе творчым жыццём калектыву. Здаецца, другога такога прыкладу мы і не ведаем, прынамсі, у нашай рэспубліцы: чвэрць стагоддзя ў адным тэатры, ад маладога артыста да сталага мастацкага кіраўніка — зайздросны і высакародны шлях!

— Ну, браце, столькі наслухаліся мы ўрачыстых слоў, што і галава можа закружыцца!— прызнаецца галоўны рэжысёр. — А гэта, лічы, пагібель. Адсвяткуем, падвядзём вынікі і зазірнём у заўтрашні дзень. Трывожна думаем, ці здолеем апраўдаць сваёй, падкрэслю, штодзённай працай самую вышэйшую ўзнагароду — любоў, якую адчулі ўсім сэрцам. Нас любяць — а гэта так многа: быць любімым...

Увесь паглыблены ў клопаты дырэктар тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Леанід Паўлавіч Валчэцкі «ловіць» гэтыя словы галоўнага рэжысёра і на твары яго з'яўляецца хмарка. Ён бярэ тэлефон і звоніць кудысьці адносна таго, што «тыя дошкі...»

Так вось яны і ішлі — свята і будзённыя клопаты. Радасны шум нейкай асабліва задушэўнай сустрэчы тэатра з гледачамі на рубяжы гадоў (учора Юрый Уласаў уздыхнуў і сказаў, што пачаўся першы дзень другой чвэрці стагоддзя тэатра) і трывожны роздум аб тым, што яшчэ трэба рабіць. Удакладняецца і ўдасканальваецца створаная тут сцэнічная Лeнініяна — «Крамлёўскія куранты», «Дзень цішыні», «Брэсцкі мір» — спектаклі юбілейнай афішы. У каторы раз артысты з горада над Бугам даюць пуцёўку маладому драматургу — ідуць рэпетыцыі «Лейтэнантаў» А. Пінчука. Шукаецца «залаты ключык», якім тэатр адкрые складаную філасофскую драму В. Лаўрэнцьева «Чалавек і глобус»...

У часе пасяджэння была зачытана тэлеграма ад радавых Савецкай Арміі — Віталія Кастальцава і Івана Мацкевіча. Яшчэ ўчора яны былі артыстамі, а цяпер апранулі салдацкія шынялі не з касцюмернага цэху, а з інтэнданцкага складу і далі прысягу служыць Радзіме, мабыць, успомніўшы і тую «Брэсцкую крэпасць», дзе ім даводзілася іграць. А рэжысура ўводзіць новых выканаўцаў у «Валыншчыку са Страконіц» і ў «Дзесяць сутак за каханне»... Па тым, як зала прыняла словы прывітання ад гэтых нядаўніх акцёраў, а цяпер салдат нашай Арміі, я таксама пераканаўся, што служыць у такім тэатры — гэта быць, як кажуць, «на віду» ўсяго горада, быць знаёмым тысячам гараджан. Па радах партэра пранеслася: «Віталій быў Грачовым — помніш? Дык жа ён Шванду іграў у «Валыншчыку», Ваня Мацкевіч...»

Я разумею хваляванне Георгія Волкава, клопат Леаніда Валчэцкага — ім належыць стрымаць натуральнае і зразумелае захапленне святам у трупе, «вярнуць» калектыў у будні, прымусіць заслужаных любімцаў публікі весці чарнавую работу кожную раніцу на рэпетыцыі і кожны вечар на спектаклі. А яны ўмеюць працаваць самааддана і настойліва, шукаючы самых лепшых форм раскрыцця ідэйна-мастацкага багацця гераічнай драмы і вясёлага вадэвіля, псіхалагічнай п'есы і рамантыкі юнацкіх парыванняў... На пісьмовым стале дырэктара тэатра я зазірнуў у разгорнутую кнігу К. С. Станіслаўскага. Падкрэслены былі наступныя словы: «Няўжо Шэкспір выношваў у душы свайго Гамлета для таго, каб мы ў пяць хвілін апрануліся ў яго касцюм і паказвалі натоўпу свае ногі, голас і вынаходлівасць?..» Кніга нагадала мне вахценны журнал на караблі — гэта перасцярога, гэта напамінак. Не, не дзеля пустой забавы раскрывае заслону тэатр у Брэсце — ім кіруюць вышэйшыя прынцыпы творчасці, здольнай уплываць на фарміраванне светапогляду і выхаванне новага чалавека. І няхай гэта будзе яго заўсёдным запаветам! Нездарма ж прадстаўнік Узброеных Сіл краіны па-вайсковаму дакладна выказаў сваё пажаданне баявому падраздзяленню на ідэалагічным фронце, тэатру-юбіляру: «Так трымаць!»

— Я вельмі паверыла ў вашу высокую патрабавальнасць, — сказала на развітанне сваім новым сябрам па мастацтву Ірына Фларыянаўна Ждановіч.

Неўзабаве яны пакажуць новыя прэм'еры. Грамадскасць будзе глядзець, як крочыць калектыў да новых вышыняў. І мы не адзін раз яшчэ напішам аб іх, артыстах з горада, які ведае планета.

Барыс БУР'ЯН.

Снежаньскі экран

«СЮЖЭТ ДЛЯ НЕВЯЛІКАГА АПАВЯДАННЯ»

Сумесная вытворчасць кінастудыі «Масфільм» і «Тэльсіяфільм» (Францыя). Аўтар сцэнарыя — Леанід Малюгін, рэжысёр-пастаноўшчык — Сяргей Юткевіч.

Карціна расказвае пра некаторыя старонкі біяграфіі Антона Паўлавіча Чэхава. Але гэта менш за ўсё фільм біяграфічны ў тым сэнсе, у якім прынята тлумачыць тэрмін «біяграфічнасць» у практыцы кіно. Іншае стала галоўным: гісторыя пісьменніцкай задумы, нараджэнне п'есы «Чайка». І калі гаварыць аб жанры, дык фільм бліжэй за ўсё стаіць да сучаснага кінаэкрана.

Галоўныя ролі выконваюць: Чэхаў — Мікалай Грынько, Маша — Ія Савіна, Ліка Мізінава — Марына Уладзі, Яўгенія Якаўлеўна — Аляксандра Панова, Патапенка — Юрый Якаўлеў.

«СТАРЫ ЗНАЁМЫ»

Так называецца каляровая шырокаэкранная музычная кінакамедыя, пастаўленая на кінастудыі «Масфільм» па сцэнарыі Барыса Ласкіна і Уладзіміра Палякова.

Вялікі майстар смеху, народны артыст СССР Ігар Ільінскі расказвае:

— Гледачы пазнаёміліся з Серафімам Іванавічам Агурцовым, героем фільма «Карнавальная ноч», больш як дзесяць гадоў назад. І вось — новая сустрэча. Цяпер мой герой «кіруе» гарадскім паркам культуры і адпачынку, арганізоўвае, па яго словах, «культурны і змястоўны адпачынак усім без выключэння працоўным...».

У фільме «Стары знаёмы» я ўпершыню выступаю ў ролі рэжысёра-пастаноўшчыка (разам з Аркадзем Кальцатым), а таму яшчэ больш хвалююся за лёс карціны...

Апрача Ігара Ільінскага ў галоўных ролях заняты таксама Мікалай Рыбнікаў, Фелікс Яворскі, Сяргей Філіпаў, Уладзімір Этуш, Наталля Селязнёва, Марыя Міронава, Тамара Носава.

«НЕ ГАРУЙ»



Вытворчасць кінастудый «Масфільм» і «Грузія-фільм». Аўтар сцэнарыя — Рэваз Габрыдзе, рэжысёр-пастаноўшчык — Георгій Данелія.

Герой карціны — малады ўрач Бенжамен Глонці, яго сябры і ворагі — нарадзіліся больш як сто гадоў назад у Францыі ў кнізе Клода Тыльё «Мой дзядзя Бенжамен».

У фільме яны перасяліліся ў дарэвалюцыйную Грузію, у глухі правінцыйны гарадок. Многія з іх змянілі імёны, прывычкі, характары.

Але пры ўсіх гэтых адступленнях ад кнігі стваральнікі кінастужкі імкнуліся захаваць у ёй яркія, гумарыстычныя характары, аўтарскую веру ў людзей, вялікі аптымізм, уласцівыя літаратурнай першакрыніцы.

У галоўных ролях здымаліся Вахтанг Кікабідзе, Сярго Закарыядзе, Анастасія Вярцінская, Софіка Чыаурэлі, Яўгеній Ляонаў, Іпаліт Хвічыя, Арыядна Шангелая, Сяргей Філіпаў.

«У БАГАТАЙ ПАНІ»

Гэта новая мастацкая кінастужка, створаная на Рыжскай кінастудыі, прыцягвае ўвагу перш за ўсё спробай перанясення на экран твора народнага пісьменніка Андрэя Упіта. Неабходна адзначыць тое пастаянства, з якім Леанід Лейманіс звяртаецца ў сваёй творчасці да латышскай літаратуры. Рэжысёр здолеў захаваць дух, думкі і атмасферу літаратурнага твора, пакладзенага ў аснову сцэнарыя. Перад намі не скрупулёзная ілюстрацыя, а самастойны драматургічны твор, у аснову якога пакладзены частка рамана «Ліст, які ўсміхаецца» і іншыя творы пісьменніка.

Галоўныя ролі выконваюць Эдуард Павулс, Ліга Ліепіня, Карл Себрыс, Зігрыда Стунгуртэ, Луіс Шміте.

■

У снежні на экранах рэспублікі будуць таксама дэманстравацца новыя мастацкія кінастужкі «Непадсудны» (кінастудыя «Масфільм»), «Аповесць пра чэкіста» (Адэская кінастудыя), «Бег інаходца» (кінастудыя «Масфільм»), «Незвычайная выстаўка» (кінастудыя «Грузія-фільм»), «Стрэл на перавале Караш» (кінастудыі Кіргізфільм» і «Казахфільм»).

З зарубежных кінакарцін гледачы змогуць прагледзець «Развітанне» (ГДР), «Мінулае вяртаецца» (Венгрыя), «Досвітак» (Туніс), «Агент міжволі» (ФРГ).

Многа цікавага раскажуць новыя хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінафільмы: «Першая граніца», «Тарусіна — 1812» «Сацыёлаг прыйшоў у цэх», «На камчацкім мерыдыяне», «Толькі ў мора», «На зямлі Цюменскай», «У нашых сяброў», «На алеі герояў», «Ноч аўтамабіліста» і інш.

Пытанням літаратуры і мастацтва прысвечаны новыя кінастужкі «Бахчысарайскі фантан», «Горкі на Украіне», «Мастак і кніга», «Павел Серабракоў», «Архітэктура і шкло», «Мода—70».

АКНО Ў ВЯЛІКІ СВЕТ

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ КАЛЕКЦЫЯНЕРАЎ-АМАТАРАЎ

У мінулую нядзелю ў Мінскім Палацы культуры прафсаюзаў сустрэліся заўзятыя калекцыянеры з усіх абласцей рэспублікі, а таксама з Масквы, Ленінграда, Кіева, Таліна, Вільнюса, Рыгі і другіх гарадоў краіны. Гэта аматары, якія збіраюць маркі, паштоўкі, канверты, значкі, медалі, старажытныя манеты. Тут можна было сустрэць студэнтаў і артыстаў, настаўнікаў і інжынераў, рабочых і навуковых работнікаў.

Вось муж і жонка Стуканавы. Галіна — работніца дзіцячай установы і студэнтка вячэрняга аддзялення БДУ. Аляксандр—аспірант. Калекцыяніраваннем яны займаюцца некалькі гадоў. Галіна сабрала каля тысячы значкоў, прысвечаных гераічнаму мінуламу і сучаснаму Беларусі. Яе калекцыя няспынна папаўняецца, абнаўляецца.

У Аляксандра — іншае захапленне. Ён калекцыяніруе паштоўкі, якія адлюстроўваюць мастацтва краін і народаў свету. Зараз у яго картатэцы сабрана каля 50 тысяч паштовак па жывапісу, скульптуры, графіцы, народнай прыкладной і дэкаратыўнай творчасці. Гэта, бадай, самая вялікая і прадстаўнічая калекцыя тэматычных паштовак сярод сабраных аматарамі рэспублікі.

Стуканавы — неаднаразовыя лаўрэаты рэспубліканскіх і гарадскіх выставак калекцыянераў. На пытанне што ім дае гэты занятак, Аляксандр адказаў:

— Гэта развівае інтэлект, пашырае веды па гісторыі культуры, літаратуры, мастацтва. На маіх паштоўках можна прасачыць гісторыю развіцця беларускага мастацтва ад першых да апошніх гадоў. Сабраным матэрыялам карыстаюцца студэнты, вучні, настаўнікі, мастацтвазнаўцы.

А вось другі аматар калекцыяніравання — артыст А. Навасельскі. Ён збірае паштоўкі па гісторыі Мінска. За некалькі гадоў у яго накапіўся такі багаты матэрыял, што яго паслугамі цяпер карыстаюцца гісторыкі, краязнаўцы, музейныя работнікі.

Леў Коласаў са школьных гадоў пачаў захапляцца калекцыяніраваннем марак. Цяпер ён інжынер, але заняткі філатэліяй не кідае. У яго альбомах сабрана больш 15 тысяч савецкіх, нямецкіх і польскіх паштовых мініяцюр. За калекцыю, прысвечаную Савецкай Беларусі, на мінулай рэспубліканскай выстаўцы ён быў узнагароджаны залатым медалем.

І такіх аматараў у нас у рэспубліцы шмат. Большасць з іх з'яўляецца членамі Беларускага аддзялення Усесаюзнага таварыства філатэлістаў. Аб яго рабоце ішла дзелавая размова на Другой рэспубліканскай канферэнцыі, якая праходзіла ў той дзень у Палацы культуры прафсаюзаў.

Старшыня праўлення Г. Дубраво ў справаздачным дакладзе прывёў цікавыя лічбы і факты з дзейнасці аддзялення. За два з паловай гады рады членаў гэтага таварыства павялічыліся больш чым у два разы. Ва ўсіх абласцях, а таксама ў Барановічах, Бабруйску, Барысаве створаны аддзяленні. У Рэчыцы, Полацку, Оршы, Браславе, Слуцку і Слоніме працуюць гарадскія філатэлістычныя гурткі.

Філатэлісты праводзяць вялікую культурна-асветную работу. Асабліва актывізавалася яна ў дні падрыхтоўкі да знамянальнага юбілею—100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

На кафедры пачатковых класаў Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага працуе пастаянна дзеючая выстаўка калекцыйных матэрыялаў, прысвечаная жыццю і дзейнасці У. І. Леніна. Стэнды з маркамі, блокамі, спецыяльнымі гашэннямі аформлены супрацоўніцай інстытута С. Ціхаміравай. Выстаўка карыстаецца поспехам у студэнтаў. Яна спрыяла таму, што пачалі працаваць гурткі юных філатэлістаў у школах Мінска, Бабруйска, Ліды, Брэста, Пружан. Пры Пружанскай сярэдняй школе № 1 створана першае ў рэспубліцы піянерскае паштовае аддзяленне сувязі са сваім штэмпелем для гашэння марак і канвертаў.

Вялікае выхаваўчае значэнне маюць філатэлістычныя выстаўкі, якія перыядычна наладжваюцца ў клубах, палацах культуры, кінатэатрах. Тысячы людзей пабывалі на рэспубліканскіх выстаўках «50-годдзе Кастрычніка», «50 гадоў КПБ і БССР», «50 гадоў Савецкай Арміі», «25-годдзе вызвалення Беларусі», «Францыя — БССР».

Беларускія філатэлісты прымаюць удзел ва ўсесаюзных і міжнародных выстаўках.

Аб размаху філатэліі ў нас можна меркаваць хаця б па такіх лічбах: за два гады ў рэспубліцы праведзена каля 60 тэматычных выставак з удзелам калекцыянераў з Расійскай Федэрацыі, Украіны, Літвы, Польскай Народнай Рэспублікі. Толькі сёлета праз магазіны і кіёскі «Саюздруку» рэалізавана розных філатэлістычных выпускаў і выданняў — марак, паштовак, канвертаў, спецыяльнай літаратуры — амаль на 400 тысяч рублёў. Гэта ў чатыры разы больш, чым было ў 1966 годзе, калі зарадзілася Беларуская арганізацыя філатэлістаў.

Аднак, як паказала канферэнцыя, работа філатэлістаў рэспублікі можа быць больш актыўнай, істотнай і карыснай, калі кіраўніцтва гэтай арганізацыі будзе больш дапамагаць шматлікім аматарам-калекцыянерам.

На канферэнцыі выбраны новы склад праўлення Беларускага аддзялення Таварыства.

І. СУЧКОЎ.

ЗНОЎ ПЕРАМАГЛІ ТОНКАСУКОНШЧЫКІ

Гэты конкурс калектываў мастацкай самадзейнасці на лепшае абслугоўванне працоўных у гарадскіх парках культуры і адпачынку працягваўся з мая па верасень. Прысвечаны ён быў 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Удзел у конкурсе прынялі калектывы дваццаці прадпрыемстваў Мінска. Імі было паказана ў парках і іншых месцах масавага адпачынку амаль сто канцэртаў. А нядаўна выканкам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных і прэзідыум абласнога савета прафсаюзаў падвялі вынікі юбілейнага конкурсу. Зноў, як і ў двух папярэдніх летніх сезонах, перамог калектыў мастацкай самадзейнасці тонкасуконнага камбіната. Яму прысуджаны пераходны прыз гарвыканкома і аблсаўпрофа і першая грашовая прэмія ў суме 500 рублёў. Пераходны прыз пакінуты ў пераможца для вечнага захавання.

Упершыню другое месца і прэмія 300 рублёў прысуджаны калектыву Палаца культуры Белсаўпрофа.

Шмат цікавых і змястоўных канцэртаў паказалі таксама працоўным калектывы мастацкай самадзейнасці Палаца культуры камвольнага камбіната, дамоў культуры цагельні № 2, упраўлення бытавых паслуг, абутковага аб'яднання «Прамень» і іншых. Горш сёлета паказалі сябе ў конкурсе калектывы мастацкай самадзейнасці аўтамабільнага і трактарнага заводаў.

У цэлым конкурс садзейнічаў развіццю мастацкай самадзейнасці, дазволіў значна палепшыць культурнае абслугоўванне працоўных у парках, ажывіць работу гэтых культасветустаноў. Вырашана падобныя конкурсы праводзіць штогод. Для пераможцаў устаноўлены новы пераходны прыз і тры грашовыя прэміі — 500, 300 і 200 рублёў.

Мастацкі кіраўнік Палаца культуры тонкасуконнага камбіната Яўген Міхалаевіч Буткоўскі нашаму карэспандэнту расказаў:

— Кожны год у пачатку вясенне-летняга сезона ў парках мы складаем графік выступленняў у кожным з іх. І кожны год вось ужо тры сезоны запар мы гэтыя графікі выконваем і перавыконваем. Сёлетні конкурс калектываў мастацкай самадзейнасці на лепшае абслугоўванне працоўных у парках своеасаблівы, ён прысвечаны ленінскаму юбілею. На пасяджэнні мастацкага савета палаца перад пачаткам сезона стаяла ў нас адно пытанне — як выканаць і перавыканаць графік абслугоўвання. А гэта зрабіць было нялёгка, бо лета, як вядома, час водпускаў, выканаўцаў цяжка сабраць.

І ўсё-такі, як паказалі вынікі, мы выступілі не шэсць разоў, як было прадугледжана графікам, а 27 разоў. Выступалі ва ўсіх парках, удзельнічалі ў свяце двара ў домакіраўніцтве № 14 (дзіцячая самадзейнасць палаца), давалі канцэрты на адкрытых пляцоўках перад воінамі ЧБВА. Найбольш цесныя кантакты ў нас завязаліся з Цэнтральным дзіцячым паркам імя М. Горкага. Хоць ён і лічыцца дзіцячым, але яго любяць наведваць і дарослыя. Тут заўсёды добрая арганізацыя вечароў, канцэртаў, па нашых самадзейных артыстаў парк высылае нават аўтобус. У парку імя Горкага ёсць чаму павучыцца паркам імя Чалюскінцаў, «50 год БССР» і іншым.

Канцэртная брыгада мела амаль пастаянны склад, але ў залежнасці ад праграмы ў ёй удзельнічала ад 20 да 35 чалавек. З праграмай, якая складалася з двух аддзяленняў, выступаў наш эстрадны аркестр, ансамбль гітарыстаў, вакальны і танцавальны калектывы, чытальнікі. Асабліва падабаліся гледачам выступленні вакаліста студэнта Мікалая Кліма, танцоўшчыкаў апаратара машынна-падліковага бюро камбіната Людмілы Юрань і навучэнца ГПТВ Васіля Сялянты. Пяць нумароў паказвалі нашы пантамімісты Леанід Любіцкі і Сяргей Сяргееў, паказвалі з вялікім поспехам. Добра ўспрымаліся танцы «Беларускі маладзёжны», рытмічны танец «Лада», «Гапак», «Рускія патанцоўкі», венгерскі танец, такія песні, як «Песня аб Канстанціне Заслонаве» Ул. Алоўнікава, «Песня аб Мінску» Ю. Семяняскі, «Абеліскі» Б. Смольскага, «Памяць сэрца» І. Лучанка.

Хоць нашы калектывы афіцыяльна не ўдзельнічаюць у конкурсе на лепшае абслугоўванне працаўнікоў сяла, але мы пастаянна шэфствуем над калгасам «Рэвалюцыя» і саўгасам «Любанскі» Любанскага раёна. Сёлета ў працаўнікоў сяла выступалі з канцэртамі шэсць разоў, а драматычны калектыў паказваў ім новую работу «Лявоніха на арбіце» па п'есе А. Макаёнка.

У нас прайшоў ужо нізавы агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Шмат нумароў адабрана на раённы агляд. Танцавальны калектыў, якім кіруе Мікалай Лапша, пакажа на раённым аглядзе танцы «Камісар», «Беларускі маладзёжны» і «Гапак». Тры нумары вылучаны на раённы агляд у харавога калектыву, шэсць — у эстраднага аркестра. Нашы драмгуртоўцы прымаюць удзел у аглядзе драматычных калектываў і народных тэатраў. Яны пакажуць спектакль па п'есе Г. Мдзівані «Твой дзядзька Міша».

Зараз ва ўсіх нашых калектывах ідзе напружаная работа, рэпетыцыі за рэпетыцыямі. Гурткоўцы і кіраўнікі калектываў прыкладаюць усе намаганні, каб на раённым, гарадскім і іншых аглядах выступіць як найлепш.

Пакупнікі цэнтральнай мінскай кнігарні сустрэліся з Іванам Шамякіным. Пісьменнік расказаў прысутным пра свае творчыя планы, адказаў на іх шматлікія пытанні, аб тым, як нараджаліся яго творы, чым жыве сёння беларуская літаратура. Многія пакупнікі набылі пад час сустрэчы кнігі І. Шамякіна з яго аўтографам.

Фота Ул. КРУКА.

СЕМІНАР БІБЛІЁГРАФАЎ

Учора ў Мінску ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна закончыў работу двухдзённы рэспубліканскі семінар-практыкум бібліёграфаў. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх абласных, а таксама гарадскіх бібліятэк Мінска.

Удзельнікі семінара абмеркавалі задачы бібліятэчных работнікаў рэспублікі па далейшым развіцці рэкамендацыйнай, даведачна-інфармацыйнай і краязнаўчай службы ў сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

На семінары былі падведзены вынікі работы бібліёграфаў за гэты год і абмеркаваны перспектыўныя планы на 1971—1975 гг.

Удзельнікі практыкума абмяняліся вопытам сваёй работы. У рабоце семінара прыняла ўдзел галоўны бібліёграф Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна Б. Смірнова.

С. КОМАВА.

МАСТАКІ Ў ГАСЦЯХ У ПАЛІГРАФІСТАЎ ГДР

Выстаўка кніг Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якая адкрылася ў Мінску 19 лістапада г. г., заканчвае сваю работу. За гэты час яе наведалі тысячы мінчан. Тут пабывалі работнікі выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю.

Цікава прайшоў семінар мастакоў і мастацкіх рэдактараў выдавецтваў рэспублікі. З падрабязным аналізам афармлення палітычнай, мастацкай і дзіцячай літаратуры выступіў галоўны мастак выдавецтва «Беларусь» М. Гуціеў. Сваімі ўражаннямі аб мастацтве афармлення падручнікаў у ГДР падзяліўся з удзельнікамі семінара галоўны мастак выдавецтва «Народная асвета» І. Андрыянаў.

Рэдактар выдавецтва «Беларусь» В. Харэўскі расказаў аб вопыце выдання кніг па выяўленчым мастацтве. З разборам афармлення навукова-тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры выступіў галоўны мастак выдавецтва «Ураджай» А. Яўменаў.

На семінары многа гаварылася аб багатым вопыце нямецкіх сяброў-паліграфістаў і той вялікай карысці, якую прынясе гэты вопыт беларускім мастакам — афарміцелям кніг.

М. ГАНЧАРОЎ.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 18444

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023